ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ! СЕРАДА, 27 ЛІПЕНЯ 1938 г. № 41 (383) ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ НАРОДНЫМ ВЫБРАННІКАМ — ДЭПУТАТАМ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ПАРЛАМЕНТА РЭСПУБЛІКІ!



Бюст В. І. Леніна для павільёна Совецкай Беларусі на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.
Работа скульптара З. Азгура. Фота Каплінскага.

МАСКВА, КРЭМЛЬ

Таварышу СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Першая Сесія Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі шле Вам, мудраму кіраўніку слаўнай большэвіцкай партыі, вялікаму правадыру і настаўніку працоўных усяго свету, натхніцелю і арганізатару перамог соцыялізма ў СССР, першаму дэпутату беларускага народа, палкае, большэвіцкае прывітанне.

Прыступаючы да выканання сваіх вялікіх і ганаровых абавязкаў, мы, дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, разам з усім беларускім народам, свае першыя мыслі і пачуцці глыбокай любві і беззаветнай адданасці зварачаем да Вас, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, першага любімейшага ўсенароднага дэпутата, да Вас, стваральніка і арганізатара дзяржаўнасці беларускага народа, стваральніка ўсенароднага шчасця.

Беларускі народ, стагоддзямі прыгнятаемы польскімі і літоўскімі князямі і памешчыкамі, бязлітасна эксплаатуемы самадзяржаўным ладам, толькі ў рэзультаце Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, пад Вашым непасрэдным кіраўніцтвам стварыў сваю дзяржаўнасць, адстаяў сваю краіну ад шматлікіх нашэствій нямецкіх і белапольскіх акупантаў і на аснове ажыццяўлення мудрай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі дабіўся грандыёзнейшых поспехаў на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва: у прамысловасці, у сельскай гаспадарцы, культуры, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу.

Беларускі народ поўны пачуцця найвялікшай удзячнасці да Вас, дарагі таварыш Сталін, да вялікай партыі большэвікоў, пад кіраўніцтвам якой Беларусь з краіны слёз і народнага гора ператварылася ў краіну народнага шчасця і радасці.

Вялікая Сталінская Канстытуцыя навекі замацавала свабоду народаў, зафіксавала іх неад'емныя правы самім рашаць свой лёс.

Выбары ў Вярхоўны Совет Беларускай ССР, як і выбары ў Вярхоўны Совет вялікага Совецкага Саюза, Саюзных і Аўтаномных рэспублік, паказалі ўсяму свету бліскучую перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, непарушнае адзінства і маналітную згуртаванасць свабодных і шчаслівых народаў нашай вялікай соцыялістычнай радзімы вакол партыі Леніна—Сталіна, іх непахісную волю ажыццяўляць палітыку комуністычнай партыі і совецкага ўрада.

Беларускі народ на аснове сваёй Канстытуцыі, пабудаванай у поўнай адпаведнасці з прынцыпамі Сталінскай Канстытуцыі, з найвялікшым уздымам і энтузіязмам правёў выбары свайго вышэйшага органа дзяржаўнай улады — Вярхоўнага Совета БССР, яшчэ раз прадэманстраваў сваё маральна-палітычнае адзінства, сваю любоў да комуністычнай партыі і да Вас, наш дарагі і любімы Іосіф Вісарыёнавіч.

У дзень вялікага свята і гаржаства—26 чэрвеня—беларускі народ нёс у сэрцах з гордасцю Ваша імя, як сцяг перамогі і, ідучы да выбарчых урнаў, аднадушна галасаваў за Вас, першага ўсенароднага дэпутата. Беларускі народ поўны гордасці і радасці, што яго першым дэпутатам у Вярхоўны Совет Беларускай ССР з'яўляецеся Вы, дарагі наш Іосіф Вісарыёнавіч.

Пад Вашым геніяльным кіраўніцтвам наша вялікая соцыялістычная радзіма з кожным днём мацнее і развіваецца, нязмерна павышаецца і расце добрабыт, матэрыяльны і культурны рост народных мас нашай радзімы. Пад Вашым геніяльным кіраўніцтвам вялікі Совецкі Саюз ідзе наперад усё да новых і новых перамог, да поўнага таржаства комунізма.

Заклятыя ворагі краіны соцыялізма — трацкісцка-бухарынскія і буржуазна-нацыяналістычныя агенты фашызма—па заданню сваіх гаспадароў прабавалі адабраць у нас заваяванае шчасце і ператварыць шчаслівы совецкі народ у рабоў капіталізма. Але подлыя ворагі пралічыліся. Гэта ім не ўдалося і ніколі не ўдасца.

Пад Вашым мудрым кіраўніцтвам совецкі народ разграміў асноўныя змяіныя гнёзды фашысцкіх ахранак, сцёр іх з твару нашай шчаслівай совецкай зямлі.

Мы добра памятаем Ваша, таварыш Сталін, мудрае ўказанне аб капіталістычным акружэнні, мы ведаем аб тым, што капіталістычны свет рыхтуе новую імперыялістычную вайну супроць краіны Советаў. Мы добра ведаем, што капіталістычны свет засылае ў нашу краіну сваіх агентаў, дыверсантаў і шпіёнаў, што яшчэ не ўсе варожыя гнёзды канчаткова выкарчаваны і знішчаны. Вось чаму мы абяцаем Вам, таварыш Сталін, яшчэ вышэй падняць рэволюцыйную пільнасць і мабілізацыйную гатоўнасць для таго, каб у любую мінуту і ў любой абстаноўцы даць рашучы ўдар усякім проіскам ворагаў.

Няхай памятаюць ворагі: совецкі народ ніколі не будзе засцігнут знянацку. Любая варожая сіла разаб'ецца ўшчэнт аб несакрушальную броню марально-палітычнага адзінства нашага магутнага народа, аб магутны непераможны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных.

Мы запэўняем Вас, Іосіф Вісарыёнавіч, што прыкладзем усю нашу большэвіцкую энергію і запал для таго, каб ператварыць нашу ордэнаносную Беларускую ССР у яшчэ больш непрыступны баявы фарпост соцыялізма па граніцы з капіталістычным светам на Захадзе. Па першаму закліку нашай партыі і ўрада, па першаму Вашаму, таварыш Сталін, закліку, — як адзін чалавек магутны совецкі народ разам са сваёй доблеснай непераможнай Чырвонай Арміяй, пад вадзіцельствам легендарнага выпрабаванага палкаводца першага маршала СССР Клімента Ефрэмавіча Варашылава, стане на абарону нашай радзімы і знішчыць ворагаў на той-жа тэрыторыі, адкуль яны пасмеюць напасці.

Родны наш таварыш Сталін!

Сабраўшыся на Першую Сесію, запэўняем Вас, што правядзем усю сваю работу ў поўнай адпаведнасці з патрабаваннямі вялікай Сталінскай Канстытуцыі. Мы, дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР, ніколі не забудзем Вашых мудрых указанняў аб тым, што дэпутат — слуга народа і што ён, акружаны вялікім народным давер'ем, абавязан няўхільна выконваць волю народа. Мы запэўняем Вас, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, што прыкладзем усе свае сілы і старанні к таму, каб быць дзеячамі ленінска-сталінскага тыпу.

Выражаючы волю беларускага народа, Вярхоўны Совет Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі запэўняе Вас, таварыш Сталін, што ён, няўхільна ажыццяўляючы вялікія прынцыпы Сталінскай Канстытуцыі, будзе берагчы і далей умацоўваць сталінскую дружбу народаў, цясней згуртуе масы вакол партыі Леніна—Сталіна і пад ленінска-сталінскім сцягам павядзе беларускі народ да новых і новых перамог комунізма.

Жывіце і здраўствуйце, наш родны таварыш Сталін, вядзіце нас наперад—да новых перамог комунізма!

Няхай жыве вялікая сталінская дружба народаў!

Няхай жыве несакрушальны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве Сталінская Канстытуцыя!

Няхай жыве наша вялікая магутная радзіма — СССР!

Няхай жыве гераічная, непераможная партыя большэвікоў!

Няхай жыве мудры правадыр працоўных усяго свету, натхніцель і арганізатар вялікіх перамог соцыялізма, лепшы друг беларускага народа—наш родны таварыш Сталін!



Бюст І. В. Сталіна для павільёна Совецкай Беларусі на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.
Работа скульптара А. М. Бразэра. Фота Каплінскага.

ПЕРШАЯ СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Зараз праводзіць сваю работу Першая Сесія Вярхоўнага Совета БССР, абранага 26 чэрвеня на аснове самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі. Адкрыццё Першай Сесіі Вярхоўнага Совета — найвялікшае свята соцыялістычнай дэмакратыі, велічная ўрачыстасць беларускай дзяржаўнасці.

Першую Сесію Вярхоўнага Совета адкрыў адзін з старэйшых дэпутатаў — прафесар медыцыны Сяргей Міхеевіч Мелкіх. Гэта сведчыць аб тым, якой павагай карыстаецца ў нашай краіне навука, з якой пашанай адносіцца совецкі народ да яе лепшых прадстаўнікоў, чэсна працуючых на карысць радзімы, да канца адданых справе партыі Леніна—Сталіна.

Першае пасяджэнне Сесіі паказала ўсю веліч нашай совецкай дэмакратыі, усю сілу моцнай сувязі народа са сваімі абраннікамі—дэпутатамі. Гэта сувязь ярка праявілася ў той аднадушнасці, з якой былі абраны старшыня Вярхоўнага Совета БССР Надзежда Грыгор'еўна Грэк і намеснікі старшыні Вярхоўнага Совета — знатны калгаснік-ордэнаносец Грыгорый Мінавіч Барушкоў, Маёраў Д. Н.

Народ абраў у Вярхоўны Совет лепшых сваіх прадстаўнікоў, доблесных сталінскіх выхаванцаў, даказаўшых на справе сваю любоў да радзімы, сваю адданасць комунізму.

Беларускі народ ганарыцца тым, што яго першым дэпутатам з'яўляецца геніяльны правадыр народаў таварыш Сталін і яго бліжэйшыя саратнікі — таварышы Молатаў, Варашылаў, Кагановіч, Калінін, Мікаян, Андрэеў, Ежоў, Жданаў. Сярод дэпутатаў народ бачыць лепшых стаханаўцаў сваіх заводаў і соцыялістычных палёў, байцоў Чырвонай Арміі, людзей тэхнікі і майстроў культуры, сумесна творачых новы свет. У гэтым велічным яднанні працы і культуры ярка праявіўся соцыялістычны гуманізм, які ставіць у цэнтр грамадскага жыцця працоўнага чалавека.

Людзі з народа прадстаўляюць соцыялістычны парламент БССР! Соцыялістычная дэмакратыя забяспечвае совецкаму народу магчымасць самому кіраваць сваёй дзяржавай, самому ўстанаўляць непахісныя законы соцыялістычнага жыцця.

Вялікі рускі народ, кіруючыся геніяльным вучэннем Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна, паказаў і паказвае ўсім іншым народам шлях да вызвалення, змятаючы ўсе перашкоды на шляху росту раней адсталых нацыянальнасцей. На аснове ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі рускі народ усямерна садзейнічае росквіту нацыянальных па форме, соцыялістычных па зместу культур усіх народаў СССР.

У Совецкай Беларусі непісьменнасць у асноўным ліквідавана. Права на адукацыю запісана ў Сталінскай Канстытуцыі і ў створанай на яе аснове Канстытуцыі БССР. З года ў год расце сетка школ па рэспубліцы, у якіх дзеці працоўных вучацца на роднай мове. Совецкая Беларусь мае сваю Акадэмію навук, дзесяткі вышэйшых навучальных устаноў, якімі яна ўправе ганарыцца, свае выдавецтвы, тэатры, клубы, бібліятэкі, Дзяржаўную філармонію, Кансерваторыю, музыкальныя вучылішчы, Тэатр оперы і балета.

У БССР выраслі таленавітыя кампазітары, мастакі, пісьменнікі, якія ўзбагацілі нашу літаратуру і мастацтва каштоўнымі творамі. З невычарпальнай крыніцы — самай гушчы працоўных мас наша навука, літаратура і мастацтва чэрпаюць усё новыя і новыя таленты. Совецкая ўлада стварыла працоўным усе ўмовы для развіцця іх дараванняў, для ўдасканалення іх талентаў.

Пад умелым кіраўніцтвам слаўнай партыі Леніна — Сталіна расце беларуская літаратура і мастацтва растуць кадры літаратараў і мастакоў. Беларускі совецкі тэатр з дапамогаю старэйшай і вядучай рускай тэатральнай культуры выхаваў плеяду майстроў, здольных стварыць высокаякаснае сцэнічнае мастацтва.

Адзін супроць другога стаяць два дыяметральна супроцьлеглых лагеры—лагер соцыялізма з яго найшырэйшымі палітычнымі свабодамі, з разгорнутай і да канца паслядоўнай дэмакратыяй і лагер капіталізма з яго прапаведдзю чалавека-нянавісніцтва, з яго тэрарыстычнай дыктатурай, ліквідуючай жалкія рэшткі буржуазнай дэмакратыі.

Там, дзе пануе фашызм — палаюць сярэднявяковыя кастры, на якіх спальваюцца геніяльныя творы майстроў сусветнай культуры — Гейне, Горкага, Вольтэра, Гюго, Руссо і многіх іншых. У нас — росквіт усіх відаў культуры. У нас кнігі друкуюцца велізарнымі тыражамі, нямыслімымі ў буржуазных краінах, і разыходзяцца яны імгненна: амаль у кожнай рабочай сям'і можна ўбачыць бібліятэку. Творы класіка соцыялістычнага рэалізма А. М. Горкага, вершы В. В. Маякоўскага і многія іншыя творы карыстаюцца любоўю мільёнаў чытачоў не толькі ў нашай краіне, але і далёка за рубяжамі.

Перамога сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет БССР з'яўляецца знамянальнай дэманстрацыяй маналітнага згуртавання совецкага народа вакол партыі Леніна—Сталіна і совецкага ўрада, які з'яўляецца выразіцелем волі народа, цвёрда і няўхільна ахоўвае яго інтарэсы, цвёрда і няўхільна вядзе яго да шчаслівага жыцця, да вяршынь комунізма.

Беларускі народ з велізарным энтузіязмам вітае сваіх дэпутатаў, будучы ўпэўненым у тым, што яго абраннікі, доблесныя сталінскія выхаванцы, усе свае сілы аддадуць справе соцыялізма, барацьбе за далейшае працвітанне сваёй бацькаўшчыны, барацьбе за народнае шчасце.

Прывітанне дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР—лепшым людзям нашай рэспублікі, абраннікам народа!

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб пасяджэнні Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР 1-га склікання 25 ліпеня 1938 года

25 ліпеня ў 6 гадзін вечара ў Вялікай зале пасяджэнняў Дома ўрада адкрылася Першая Сесія Вярхоўнага Совета БССР 1-га склікання.

Па прапанове дэпутата тав. **Матвеева А. П.** Сесію адкрывае адзін з старэйшых дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР ад Гомельскай-Кіраўскай выбарчай акругі Гомельскай вобласці прафесар медыцыны тав. **Мелкіх Сяргей Міхеевіч.**

Пасля прамовы тав. **Мелкіх С. М.** Вярхоўны Совет прыступіў да выбараў старшыні і намеснікаў старшыні Вярхоўнага Совета БССР.

Старшынёй Вярхоўнага Совета БССР аднагалосна выбрана тав. **Грэк Надзежда Грыгор'еўна;** намеснікам старшыні выбраны тав. **Маёраў Дзімітрый Нікіфаравіч** і тав. **Барушкоў Грыгорый Мінавіч.**

Вярхоўны Совет прыняў наступны рэгламент Сесіі:

1. Пасяджэнні Сесіі Вярхоўнага Совета БССР адбываюцца з 11 да 3 гадзін дня і з 6 да 9 гадзін вечара.
2. Даклады па пытаннях парадку дня Сесіі Вярхоўнага Совета БССР зацвярджаюцца старшынёй Вярхоўнага Совета БССР.
3. Кожная група дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР, якая налічвае не менш 30 чалавек, можа выставіць свайго садакладчыка.
4. Дакладчыкам прадастаўляецца — для даклада 1 гадзіна і для заключнага слова 30 мінут; садакладчыкам—для садаклада 30 мінут, для заключнага слова 15 мінут.
5. Прамоўцам прадастаўляецца слова — у першы раз 20 мінут, у другі раз 5 мінут.
6. Асабістыя заявы і фактычныя даведкі ўносяцца ў пісьмовым выглядзе і агалашаюцца старшынёй Вярхоўнага Совета БССР адразу або ў канцы пасяджэння, у залежнасці ад іх зместу.
7. Унечарговыя запытанні ўносяцца ў пісьмовым выглядзе і агалашаюцца старшынёй Вярхоўнага Совета БССР адразу.
8. Для слова ў парадку прадастаўляецца 5 мінут.
9. Па матывах галасавання прадастаўляецца 3 мінуты.

Па прапанове тав. **Гладышава Е. І.,** выступіўшага ад групы дэпутатаў Магілеўскай і Палескай абласцей, Вярхоўны Совет БССР прыняў наступны парадак дня:

1. Выбары Мандатнай камісіі Вярхоўнага Совета БССР.
2. Аб пастаянных камісіях Вярхоўнага Совета БССР.
3. Унясенне змен і дадаткаў у некаторыя артыкулы Канстытуцыі БССР.
4. Выбранне Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР:

а) старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР;

б) намеснікаў старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР;

в) сакратара Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР;

г) членаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР.

5. Стварэнне ўрада БССР — Совета Народных Камісараў БССР.
6. Аб пакрыцці дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР расходаў, звязаных з выкананнем дэпутацкіх абавязкаў.

Для праверкі поўнамоцтваў дэпутатаў Вярхоўнага Совета БССР выбрана Мандатная камісія ў складзе:

Старшыня Мандатнай камісіі Вярхоўнага Совета БССР тав. **Шыбалка Владзімір Гаўрылавіч** — дэпутат ад Ветрынскай выбарчай акругі Віцебскай вобласці.

Члены Мандатнай камісіі Вярхоўнага Совета БССР:

1. **Драздова Варвара Васільеўна** — дэпутат ад Боркавіцкай выбарчай акругі Віцебскай вобласці.
2. **Казлоў Кірыл Ісідаравіч** — дэпутат ад Высоцкай выбарчай акругі Магілеўскай вобласці.
3. **Акулёнак Анна Іосіфаўна** — дэпутат ад Ленінскай выбарчай акругі горада Магілева.
4. **Ачкасаў Аляксандр Іванавіч** — дэпутат ад Заслаўскай выбарчай акругі Менскай вобласці.
5. **Музыка Сцепаніда Якаўлеўна** — дэпутат ад Петрыкаўскай выбарчай акругі Палескай вобласці.
6. **Ісакоў Аляксандр Іванавіч** — дэпутат ад Мазырскай выбарчай акругі Палескай вобласці.
7. **Баравікоў Ігнат Емельянавіч** — дэпутат ад Нова-Беліцкай выбарчай акругі Гомельскай вобласці.
8. **Усаценка Георгій Іларыёнавіч** — дэпутат ад Старобінскай выбарчай акругі Менскай вобласці.

У абстаноўцы выключнага ўздыму, пад доўга не змаўкаючыя авацыі Сесія прыняла тэкст прывітальнага пісьма першаму дэпутату Вярхоўнага Совета БССР правадыру і настаўніку працоўных усяго свету Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

На гэтым першае пасяджэнне Вярхоўнага Совета БССР закрываецца.

(Працяг матэрыялаў пра Сесію гл. на 2 стар.)

Першая Сесія Вярхоўнага Совета Беларускай ССР 1-га склікання

ПРАМОВА ДЭПУТАТА С. М. МЕЛКІХ

ПРЫ АДКРЫЦЦІ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Дарагія таварышы дэпутаты! Дазвольце павіншаваць вас з вялікім святам беларускага народа — з днём адкрыцця Першай Сесіі Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. **(Апладысменты).**

Перамога сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет з'явілася магутнай дэманстрацыяй ідэйна-палітычнага і маральнага адзінства совецкага народа, дэманстрацыяй найвялікшага давер'я да нашай любімай партыі, да яе ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта, дэманстрацыяй любві і бязмежнай адданасці да любімага бацькі, друга і правадыра, вялікага генія чалавецтва — нашага дарагога Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты, усе ўстаюць, воклічы: «Таварышу Сталіну ура!», «Вялікаму Сталіну ура!»).**

Беларускі народ усклаў на нас, дэпутатаў Вярхоўнага Совета, адказны і ганаровы абавязак — кіраваць рэспублікай, даручыў нам на аснове вялікай Сталінскай Канстытуцыі правесці Першую Сесію Вярхоўнага Совета БССР.

Беларускі народ у рэзультаце перамог Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі ўпершыню ў гісторыі атрымаў сваю дзяржаўнасць. Тварцом дзяржаўнасці беларускага народа з'яўляецца геній чалавецтва, правадыр працоўных і прыгнечаных усяго свету наш любімы Сталін. **(Бурныя, доўга незмаўкаючыя апладысменты. Усе ўстаюць. Воклічы: «Вялікаму Сталіну ура!»).**

Родная комуністычная партыя Леніна—Сталіна, вялікі брацкі рускі народ дапамаглі беларускаму народу адстаяць сваю незалежнасць у барацьбе з германскімі і белапольскімі інтэрвентамі. Геніяльны стратэг рэволюцыі таварыш Сталін непасрэдна кіраваў разгромам германскіх і белапольскіх акупантаў, прабаваўшых паняволіць беларускі народ. Пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна працоўныя масы нашай радзімы разграмілі ўсіх унутраных і знешніх ворагаў.

У годы мірнага будаўніцтва, у годы вялікіх сталінскіх пяцігодак, у годы развіцця гаспадарчага і культурнага жыцця Беларусі таварыш Сталін асабіста ўважліва штодзённа і штогадзінна сачыў і сочыць за жыццём нашай рэспублікі, аказваючы ёй штодзённую дапамогу, дапамагаючы знішчыць прадажнікаў — нацыянал-фашыстаў, трацкісцка-бухарынскіх, польскіх і іншых шпіёнаў і дыверсантаў, здраднікаў нашай радзімы. Беларускі народ вечна будзе дзякаваць вялікаму рускаму народу за аказаную брацкую дапамогу ў справе вызвалення ад германа-польскіх інтэрвентаў і за аказваемую дапамогу ва ўмацаванні соцыялістычнай гаспадаркі Беларусі.

Цяжка была доля беларускіх працоўных пры царызме. Непасільная праца, бяспраўе і рэлігійны дурман — вось які быў яго лёс.

У мінулым Беларусь была краінай каланіяльнага рабства.

Беларускі народ перанёс жахі германскай і белапольскай акупацый. З агнём і мячом ішлі акупанты па нашай краіне. Жандары, кулакі выціскалі з сялян апошнія сокі, асуджаючы на выміранне беларускую вёску.

За 18 год Совецкая Беларусь, дзякуючы правільнаму правядзенню ленінска-сталінскай палітыкі, дапамозе вялікага брацкага рускага народа, з забітай, адсталай, некультурнай, з краіны жабрацтва, бяспраўя і гнёту працоўных ператварылася ў роўную сярод адзінаццаці роўных совецкіх рэспублік, квітнеючую, індустрыяльную, калгасную ордэнаносную Беларускую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку.

Выраслі новыя гіганты індустрыі, ператварыліся гарады. За годы двух сталінскіх пяцігодак прамысловая прадукцыя вырасла ў 22 разы ў параўнанні з 1913 годам і складае $^3/_4$ усёй валавой прадукцыі народнай гаспадаркі.

Калгаснікі паспяхова будуюць сваё заможнае і культурнае жыццё. Перамога калгаснага ладу назаўсёды пазбавіла сялянства ад жабрацтва.

Небывала казачнымі з'яўляюцца поспехі совецкай культуры і навукі. У ВНУ дзесяткі тысяч маладых людзей навучаюцца на сваіх родных мовах.

Працоўныя масы штодзённа на сваёй роднай мове чытаюць каля 200 газет. Совецкая Беларусь мае сваю Акадэмію навук, выдавецтва, клубы, бібліятэкі. У дарэволюцыйнай Беларусі не было ні адной навукова-даследчай установы, а зараз іх 41; да рэволюцыі ў Беларусі 75 проц. усяго насельніцтва было непісьменным, а сярод жанчын — 90 проц. Зараз у Совецкай Беларусі непісьменнасць у асноўным ліквідавана.

Пышным цветам квітнее культура Совецкай Беларусі, нацыянальная па форме, соцыялістычная па зместу.

Я, як прадстаўнік совецкай інтэлігенцыі, асабліва перажываю росквіт блізкай, роднай мне совецкай культуры. Некалькі год да рэволюцыі мне давялося працаваць у халерных бараках. Цяпер гэтай хваробы няма. З твару беларускай зямлі зніклі такія хваробы, як халера, каўтун, чума, воспа. У выдатных клініках лепшыя людзі навукі аддаюць свае веды, каб поўнасцю ліквідаваць гэтыя хваробы.

У 1914 годзе на вёсцы не было ні аднаго радзільнага дома, зараз у калгасах іх 219; не было ні аднаго акушорскага пункта, а зараз іх 331; не было ні адной стацыянарнай койкі, зараз іх 1.620; не было ні аднаго медпункта, зараз іх 97.

З дня выдання дэкрэта аб забароне абортаў, у Беларусі выплачана 55 мільёнаў руб. многасямейным маці.

Таварышы дэпутаты, нашы поспехі ў навуцы велізарны, таму што перад намі заўсёды вучэнне Леніна—Сталіна, якое з'яўляецца сцягам перадавой навукі. У гісторыі чалавецтва ніколі не было больш вялікіх перамог навукі, чым перамогі, атрыманыя пад кіраўніцтвам Леніна—Сталіна.

Таварыш Сталін гаварыў, што совецкая навука — гэта такая навука, якая не адгараджваецца ад народа, а гатова служыць народу, гатова перадаць народу ўсе заваяванні навукі, якая абслугоўвае народ не па прымусу, а добраахвотна.

Усе гэтыя поспехі залатымі літарамі запісаны ў вялікай хартыі народаў — Канстытуцыі СССР, тварцом якой з'яўляецца наш дарагі Іосіф Вісарыёнавіч Сталін. **(Бурныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю. Воклічы: «Ура таварышу Сталіну! Ура!»).**

Усіх гэтых поспехаў працоўныя дабіліся ў жорсткай класавай барацьбе пад кіраўніцтвам любімай партыі бальшэвікоў і вялікага Сталіна **(працяглыя апладысменты)**, дзякуючы зоркаму воку наркамунутдзельцаў, якія на чале са сталінскім наркомам Нікалаем Іванавічам Ежовым **(працяглыя апладысменты)** знішчылі подлых здраднікаў радзімы — трацкісцка-бухарынскіх і нацдэмаўскіх агентаў германа-польскага фашызма. Нашы слаўныя наркамунутдзельцы з дапамогай усяго совецкага народа знішчылі, знішчаюць і надалей будуць знішчаць усіх ворагаў народа, шпіёнаў і здраднікаў радзімы, дзе-б яны ні скрываліся і як-бы яны ні маскіраваліся.

Таварышы дэпутаты, поспехі нашы вялікі. Але мы, знаходзячыся на рубяжы з капіталістычным Захадам, ні на адну хвіліну не павінны забываць словы таварыша Сталіна аб неабходнасці трымаць народ у стане мабілізацыйнай гатоўнасці. Вялікая наша соцыялістычная дзяржава — адзіная краіна ў свеце, якая паслядоўна і да канца праводзіць палітыку міру, змагаецца за мір, супроць вайны, супроць фашысцкіх агрэсараў.

Мы хочам жыць у міры. Нам не патрэбна вайна, але мы гатовы даць сакрушальны ўдар усім падпальшчыкам вайны, калі яны пасмеюць парушыць граніцы нашай свяшчэннай радзімы. Мы ўсе, як адзін, устанем на абарону нашай любімай соцыялістычнай радзімы.

Наша Чырвоная Армія ў цесным яднанні з усім народам вялікага Совецкага Саюза, пад кіраўніцтвам першага маршала Совецкага Саюза, жалезнага наркома абароны таварыша Клімента Ефрэмавіча Варашылава **(бурныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю, крыкі «ура». Тав. Мелкіх: — Жалезнаму наркому Варашылаву — ура! Бурныя апладысменты)** дасць такі сакрушальны адпор, які нагалаву разаб'е ўсіх фашысцкіх мракабесаў. **(Апладысменты).**

Адкрываючы Першую Сесію Вярхоўнага Совета БССР, мы яшчэ раз скажам дзякуй нашай любімай комуністычнай партыі бальшэвікоў, пад кіраўніцтвам якой рускі рабочы клас дапамог беларускаму народу стварыць сваю Совецкую Беларусь.

Вялікае дзякуй мудраму Сталіну, пад геніяльным кіраўніцтвам якога беларускі народ пабудаваў сваю соцыялістычную дзяржаву, сваё шчаслівае жыццё.

Няхай жыве вялікая дружба народаў!

Няхай жыве сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве вялікі непераможны сцяг Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна!

Няхай жыве першы дэпутат беларускага народа, вялікі правадыр і геній, тварэц чалавечага шчасця, наш бацька і друг Іосіф Вісарыёнавіч Сталін! **(Бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю, воклічы: «Вялікаму Сталіну — ура!», «Лепшаму другу беларускага народа таварышу Сталіну — ура!». Авацыя ўсёй залы).**

Таварышы дэпутаты! Абвяшчаю Першую Сесію Вярхоўнага Совета БССР адкрытай. **(Працяглыя апладысменты, усе ўстаюць, воклічы: «Вялікаму Сталіну — ура!». Апладысменты).**

ДЗЁННІК ПАСЯДЖЭННЯ ПЕРШАЙ СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

25 ліпеня 1938 года

Да 6 гадзін вечара залу Дома ўрада БССР запоўнілі лепшыя людзі беларускага народа — дэпутаты соцыялістычнага парламента БССР і шматлікія госці — стаханаўцы прадпрыемстваў, прадстаўнікі партыйных, комсамольскіх, прафсаюзных арганізацый і ваенных часцей.

Сярод дэпутатаў многа ордэнаносцаў — палкіх патрыётаў соцыялістычнай радзімы, работа якіх адзначана ўрадам вышэйшай узнагародай — ордэнамі Саюза ССР. На Сесію прыбылі госці — дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР — ордэнаносцы Н. Е. Батоўкін, Д. Я. Навіцкі і інш.

Позіркі ўсёй залы накіраваны да ўпрыгожанай трыбуны, дзе ў акружэнні букетаў жывых кветак устаноўлен вялікі барэльеф любімага правадыра працоўнага чалавецтва роднага, мудрага Сталіна.

На трыбуну падымаецца сакратар Менскага абкома КП(б)Б, дэпутат ад Ленінскай выбарчай акругі горада Менска А. П. Матвееў. Ён уносіць прапанову даручыць адкрыць Першую Сесію Вярхоўнага Совета БССР аднаму з старэйшых дэпутатаў прафесару медыцыны Сяргею Міхеевічу Мелкіх.

Пад бурныя апладысменты ўсёй залы дэпутат С. М. Мелкіх віншуе сабраўшыхся з вялікім святам беларускага народа — днём адкрыцця Першай Сесіі беларускага соцыялістычнага парламента. Тав. Мелкіх гаворыць аб бліскучай перамозе сталінскага блока комуністаў і беспартыйных на выбарах у Вярхоўны Совет БССР, аб бязмежнай адданасці народа да вялікай партыі Леніна—Сталіна, да любімага правадыра, настаўніка і бацькі працоўнага чалавецтва Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна.

— Толькі ў рэзультаце Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, — гаворыць дэпутат Мелкіх, — беларускі народ упершыню ў гісторыі атрымаў сваю дзяржаўнасць. Наша родная комуністычная партыя Леніна—Сталіна і пад яе кіраўніцтвам вялікі брацкі рускі народ дапамог беларускаму народу адстаяць сваю незалежнасць ад германа-польскіх акупантаў. Зараз наша рэспубліка — роўная сярод адзінаццаці роўных брацкіх саюзных рэспублік, святкуе таржаство ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Гіганцкімі крокамі развіваецца соцыялістычная прамысловасць і сельская гаспадарка БССР.

Тав. Мелкіх заклікае дэпутатаў не аслабляць бальшэвіцкай пільнасці, памятаць словы вялікага Сталіна аб капіталістычным акружэнні.

Калі тав. Мелкіх заканчвае сваю прамову словамі ўдзячнасці, накіраванымі да комуністычнай партыі і вялікага правадыра таварыша Сталіна, усе, у адзіным парыве бязмежнай адданасці і любві да таварыша Сталіна — устаюць. З усіх канцоў залы нясуцца поўныя захаплення прывітальныя воклічы ў гонар любімага і мудрага правадыра.

Сесія аднагалосна выбірае старшынёй Вярхоўнага Совета БССР трэцяга сакратара ЦК КП(б)Б, дэпутата ад Веткаўскай сельскай выбарчай акругі Надзежду Грыгор'еўну Грэк. Тав. Мелкіх запрашае тав. Грэк заняць месца старшыні Вярхоўнага Совета БССР.

Затым Сесія па прапанове дэпутата ад Панізоўскай выбарчай акругі Віцебскай вобласці тав. Калінічава Т. В. і дэпутата ад Уваравіцкай выбарчай акругі Палескай вобласці тав. Шурмана І. С. выбірае намеснікамі старшыні Вярхоўнага Совета БССР дэпутата ад Віцебскай-Пролетарскай выбарчай акругі машыніста-крываносаўца, які нядаўна вылучан начальнікам паравоза ной службы віцебскага аддзялення Заходняй чыгункі тав. Майорава Д. Н. і дэпутата ад Лоеўскай сельскай выбарчай акругі знатнага калгасніка — загадчыка аўцаводчай фермы калгаса «Гомельскі пролетарый» — ордэнаносца Г. М. Барушкова.


Старшыня Вярхоўнага Совета БССР тав. Грэк запрашае тав. Майорава і Барушкова заняць свае месцы.

Па прапанове дэпутата ад Кагановіцкай выбарчай акругі г. Менска тав. Савіцкага П. П. Сесія зацвердзіла рэгламент і парадак работы Сесіі.

Потым выбіраецца Мандатная камісія ў складзе 9 чалавек пад старшынствам дэпутата ад Ветрынскай выбарчай акругі тав. Шыбалка В. Г.

З вялікім уздымам, пад бурныя авацыі і крыкі «ура Сталіну!», «Няхай жыве вялікі Сталін!», Сесія прыняла прывітальную тэлеграму першаму дэпутату беларускага народа, любімаму таварышу Сталіну.

На гэтым першае пасяджэнне Сесіі закрываецца. (БЕЛТА).



Дэпутат Вярхоўнага Совета Саюза ССР т. Н. Е. Батоўкін і дэпутат Вярхоўнага Совета БССР т. Г. М. Барушкоў на пасяджэнні Сесіі. Фота Райхліна.

ПІСЬМЕННІКІ БССР — ДЭПУТАТАМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Мы, пісьменнікі Совецкай Беларусі і работнікі ССПБ, сабраўшыся на мітынг, прысвечаны адкрыццю Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР, шлём сваё гарачае прывітанне слаўным выбраннікам беларускага народа, дэпутатам соцыялістычнага парламента нашай рэспублікі!

Дарагія таварышы дэпутаты!

У вялікі гістарычны дзень 26 чэрвеня 1938 года працоўныя Совецкай Беларусі з радасцю прышлі да выбарчых урнаў і аддалі свае галасы за вас, кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, слаўных сталінскіх пітомцаў, верных патрыётаў совецкай радзімы.

Працоўныя Совецкай Беларусі давэрылі Вам кіраўніцтва дзяржавай і мы ўпэўнены ў тым, што Вы гэта давер'е апраўдаеце.

Вялікае шчасце выконваць свягую волю народа, кіраваць самай дэмакратычнай у свеце совецкай дзяржавай.

В каком парламенте это возможно,
Чтобы рядом сидели шахтер и певец,
Ученый и каменщик, врач и художник,
Вождь и доярка, комбриг и боец.

Мы асабліва шчаслівы таму, што першым дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР з'яўляецца вялікі майстар чалавечага шчасця, мудры правадыр народаў Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна Беларусь ператварылася з прыгнечанай ускраіны былой царскай Расіі ў квітнеючую ордэнаносную рэспубліку.

Пры брацкай дапамозе вялікага рускага народа, у дружнай сям'і народаў магутнага Совецкага Саюза вырасла і расквітнела БССР.

Пачатак работы Першай Сесіі Вярхоўнага Совета БССР працоўныя сустракаюць новымі вытворчымі перамогамі, багатым сталінскім ураджаем.

Заможна і шчасліва жывецца на вялікай Совецкай зямлі! Гэтага шчасця, гэтай радасці мы ніколі нікому не аддамо!

Мы, пісьменнікі Совецкай Беларусі, абяцаем Вам, таварышы дэпутаты, напісаць новыя творы пра наша прыгожае жыццё, пра шчаслівых людзей, верных сыноў і дачок нашай радзімы.

Будзем яшчэ лепш працаваць на радасць працоўным усяго свету, на страх ворагам народа!

Павысім рэволюцыйную пільнасць! Ніякай трацкісцка-бухарынскай, нацыянал-фашысцкай погані не таптаць нашай квітнеючай зямлі!

Мы ўпэўнены ў тым, што дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР будуць пільна стаяць на варце народнага шчасця, памятаючы вялікі сталінскі наказ дэпутатам.

Мы ўпэўнены ў тым, што дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР будуць заўсёды помніць, што дэпутат — пасланец народа, слуга народа, выканаўца волі народа.

Пасылаючы Вам самае гарачае прывітанне, мы жадаем Вам паспяховай работы на славу нашай радзімы, на шчасце совецкага народа!

Няхай жывуць слаўныя выбраннікі народа!

Няхай жыве сталінскі блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве геніяльны тварэц самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі, мудры правадыр комуністычнай партыі і народа любімы таварыш Сталін!

БУДЗЕМ ЗМАГАЦЦА ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ МАСТАЦТВА

Мастацтва беларускага народа, як і мастацтва ўсіх народаў нашай неабсяжнай шчаслівай радзімы, глыбокімі каранямі звязана з жыццём народа, з яго побытам. Яно адлюстроўвае ўсё яго бязрадаснае мінулае і яго шчаслівае сучаснае. Гнусны царскі ўрад не прызнаваў за Беларуссяй права на сваё мастацтва, ён не ведаў і не хацеў ведаць яго талентаў.

Але як немагчыма ў здаровага чалавека адняць жаданне жыць, так нельга прымусіць народ развучыцца спяваць, танцаваць, гаварыць сваёй роднай мовай і, незалежна ад жаданняў гнусных правіцеляў, беларускае мастацтва існавала і развівалася. З гушчы народа выходзілі спевакі, музыканты, паэты і ніякімі адміністрацыйнымі мерамі нельга было спыніць і забіць гэта вялікае жаданне беларускага народа спяваць і гаварыць аб жыцці сваім. Цяжкое існаванне беларускага народа, вядома, накладвала адбітак і на яго мастацтва. Усе скаргі на прыгнечанасць, уся боль нярадаснага жыцця адлюстроўваліся ў яго вершах і песнях. Але цяжкое жыццё не пазбаўляла беларускі народ ад мары пра сваё шчасце.

Гэтае шчасце настала пасля Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. У вольнай Совецкай Беларусі расквітнела багацейшае мастацтва народа.

Адною з заваёў соцыялістычнай культуры БССР з'яўляецца Дзяржаўны тэатр оперы і балета. Шкоднікі, нацыянал-фашысцкія шпіёны змагаліся ў свой час усімі мерамі супроць арганізацыі гэтага тэатра. Яны «даводзілі», што ў нас, у БССР, няма ні сваіх спевакоў, ні сваіх музыкантаў, ні сваіх кампазітараў для стварэння сваіх беларускіх опер. Доўгі час беларускім кампазітарам дарога ў оперу была закрыта. Іх не толькі не запрашалі ў тэатр, але не прызнавалі за імі права на стварэнне сваіх арыгінальных опер. І ўсё-ж яны іх стварылі. Цяпер напісаны ўжо дзве оперы: «Міхась Падгорны» Цікоцкага і «Дрыгва» дэпутата Вярхоўнага Совета БССР тав. Багатырова. Гэтыя оперы з'яўляюцца поўнацэннымі музыкальнымі творамі. Яны станоўча ацэнены ўсёй грамадскасцю Менска і калектывам тэатра. Яны таксама прыняты да пастаноўкі ў іншых гарадах Совецкага Саюза.

Такое-ж становішча з першым беларускім балетам «Салавей» Крошнера. Гэты балет прынят да пастаноўкі, акрамя нашага тэатра, таксама ў тэатрах Одэсы і Кіева.

Здавалася-б, усё зроблена. Але паміж кіраўніцтвам Опернага тэатра і кампазітарамі няма здаровых творчых адносін. З кампазітарамі не падпісваюць дагавораў, ім не забяспечваюць нармальных умоў для работы. Гэта, безумоўна, адбіваецца і на рабоце і кампазітараў і на рабоце тэатра па падрыхтоўцы опер і балета. А ад якасці падрыхтоўкі гэтых твораў у значнай ступені залежыць поспех дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Патрэбна вельмі вялікая і сур'ёзная падрыхтоўка да гэтага важнага мерапрыемства.

Упраўленне па справах мастацтваў і дырэкцыя тэатра вельмі дрэнна працуюць па забеспячэнню тэатра высокаякаснымі творчымі кіраўнікамі. Балетная трупа, якая з'яўляецца адным з важных творчых калектываў тэатра, не забяспечана высокаякасным мастацкім кіраўніцтвам. Укамплектаванне балетнай трупы неабходнымі працаўнікамі амаль сарвана. Да гэтага часу не вызначан яшчэ канчатковы пастаноўшчык першага беларускага балета «Салавей».

Усё гэта вынік таго, што на чале тэатра і яго мастацкага кіраўніцтва сядзіць чалавек, які не справіўся з сваёй работай. На вялікім пяцідзённым сходзе ў тэатры аб гэтым гаварыў увесь калектыў.

Адкрылася Першая Сесія Вярхоўнага Совета БССР. Мы просім нашых дэпутатаў, абгаварваючы пытанні мастацтва ў нашай рэспубліцы, спыніцца на такіх, па-нашаму, асноўных момантах: забеспячэнне Упраўлення па справах мастацтваў моцнымі, праверанымі кіраўнікамі; забеспячэнне Тэатра оперы і балета сапраўды бальшэвіцкім, кваліфікаваным кіраўніцтвам; прадастаўленне Беларускаму тэатру оперы і балета магчымасці ў бліжэйшы час увайсці ў новае тэатральнае памяшканне, каб адкрыць тэатр у XXI гадавіну Кастрычніка пастаноўкай арыгінальнай беларускай оперы «Міхась Падгорны» Цікоцкага.

Мы, работнікі мастацтва, запэўняем Вярхоўны Совет, што мы прыкладзем усе намаганні да таго, каб узняць мастацтва Беларусі яшчэ на большую вышыню. Мы прыкладзем усе сілы, каб ліквідаваць вынікі шкодніцтва ў беларускім мастацтве. Мы даем абяцанне быць пільнымі і зробім усё для таго, каб выгнаць з сваіх радоў усіх шкоднікаў і іх памочнікаў. Запэўняем Вярхоўны Совет высока несці сцяг работнікаў соцыялістычнага мастацтва.

Няхай жыве Першая Сесія Вярхоўнага Совета БССР!

Няхай жыве вялікі беларускі народ!

Няхай жыве вялікая партыя бальшэвікоў і яе кормчы — любімы Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Ф. А. ПІННО,
балетмейстар-рэпетытар Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

Стварыць умовы для работы тэатра

Дзень адкрыцця Першай Сесіі Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ўвойдзе ў гісторыю беларускага народа як яркае, знамянальнае свята. З вялікай радасцю кожны патрыёт соцыялістычнай радзімы азірнецца ў гэты дзень на пройдзены шлях і ўбачыць, якія велізарныя перамогі здолеў атрымліваць наш выдатны народ, вызвалены ад прыгнечання і эксплаатацыі.

Рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя сустракаюць Сесію Вярхоўнага Совета БССР новымі вытворчымі поспехамі.

Магутнай крыніцай б'е совецкая культура, здзіўляючы ўвесь свет выключнымі поспехамі совецкіх майстроў. Партыя і ўрад стварылі ўсе ўмовы для развіцця мастацтваў народаў Совецкага Саюза. Растуць маладыя майстры сцэны. Будуюцца тэатры. Ствараюцца каштоўныя творы мастацтва.

У БССР шкоднікі, праводзячы буржуазна-нацыяналістычную лінію, імкнуліся адарваць беларускае мастацтва ад мастацтва іншых народаў СССР, у першую чаргу ад мастацтва рускага народа. Не выпадкова-ж, што Рускі тэатр у БССР, як тэатр, аб мастацкім твары якога можна гаварыць, існуе ўсяго два гады. Да гэтага часу сталага, бесперапынна дзейнічаючага рускага тэатра ў Беларусі не было. Існавалі выпадковыя калектывы, якія ігралі на рускай мове і, вядома, не мелі мастацкай каштоўнасці. Адзіная з саюзных сталіц — Менск не мела свайго рускага тэатра. Да гэтага часу адсутнасць рускага тэатра ў сталіцы БССР, у сілу шкоднай традыцыі мінулых год, лічыцца з'явай зусім нармальнай. Адсюль і тыя прычыны, якія перашкаджалі росту занава арганізаванага два гады назад Рускага тэатра. Варожыя адносіны да гэтага тэатра з боку Упраўлення па справах мастацтваў, у якім арудавалі ворагі народа, балюча адбіліся на мастацкім і агульным стане тэатра.

Самая вялікая і самая агідная хвароба тэатра, пастаўленага ва ўмовы масавага выпуску мастацкай прадукцыі,— штамп і рамесніцтва, адсутнасць свежай творчай думкі ў рабоце над спектаклем. Рускі тэатр, пастаўлены фінансавай палітыкай Упраўлення па справах мастацтваў у зусім безвыходнае становішча, прымушан быў ставіць непрадуманыя, спехам зробленыя спектаклі, што ні ў якой меры не магло і не можа задаволіць творчы калектыў.

Наш тэатр хоча жыць поўным, актыўным творчым жыццём, з дня ў дзень удасканальваючы свае веды і памнажаючы практычны вопыт.

Мы хочам стаяць у адной шарэнзе з лепшымі тэатрамі рэспублікі. А для гэтага неабходна карэнным чынам перагледзець адносіны Упраўлення па справах мастацтваў да нашага тэатра.

Упраўленне па справах мастацтваў павінна быць ачышчана ад людзей, якія няздольны ажыццяўляць правільнае бальшэвіцкае кіраўніцтва ўсім фронтам мастацтваў нашай БССР.

Рускі тэатр мае права на існаванне ў Беларусі. У яго ёсць для гэтага кадры і вялікае жаданне ў поўнай меры сваіх сіл працаваць, ствараючы вялікія, каштоўныя, патрэбныя нашай радзіме творы мастацтва.

Д. А. ОРЛОЎ,
актор і рэжысёр Рускага тэатра БССР.

ПАПЯРЭДНІЯ ЗАЎВАГІ

Беларускі дзяржаўны тэатр юнага гледача канчае свой творчы год спектаклем «Таямнічы востраў» па Жуль Верну. За год пасля рэарганізацыі тэатра калектыў ажыццявіў тры пастаноўкі: «Як гартавалася сталь», «Наша зброя» і «Ноч у верасні». Працуючы над гэтымі спектаклямі, творчы калектыў тэатра набыў пэўны вопыт у паказе герояў совецкіх людзей.

Для совецкага актора вялікі гонар — уменне правільна раскрыць унутраны свет герояў Сталінскай эпохі.

Але нашаму совецкаму актору неабходна навучыцца паказваць і герояў мінулых эпох. Нашаму калектыву настаў час для работы над класічнымі творамі. П'есу «Таямнічы востраў» мы разглядаем, як трамплін для такой работы.

«Таямнічы востраў» — адзін з яркіх твораў Жуль Верна. Жуль Верн — вялікі лятуценнік, пявец навукі, выхоўвае ў нашым маладым пакаленні дапытлівасць, цікавасць, палкае імкненне да перамогі над сляпой стыхіяй прыроды, веру ў сілу чалавечага розуму, мэтаімкнёнасць, дружбу і таварыскую салідарнасць.

Эпіграфам для нашага спектакля могуць служыць словы выдатнага рускага вучонага Мічурына: «Нам не варта чакаць міласці ад прыроды, трэба яе заваяваць». Нашым спектаклем мы хочам расказаць маладому гледачу аб энергічных, ніколі не сумуючых людзях, аб сіле чалавека і сіле яго творчай фантазіі. Барацьба людзей, спаяных моцнай дружбай, перамагае, здавалася-б, неадолімыя цяжкасці. «Немагчымага няма» — любімая песня жульвернаўскіх каланістаў.

Змест п'есы нам падказвае героіка-рамантычнае вырашэнне спектакля. Вобраз дзікай, некранутай прыроды, жорсткай, суровай, часам страшнай і недаступнай, як «Аргус, ахоўваючы свае багацці», дыктуе манументальныя, а не бутафорскія формы афармлення. Асабліва важна паказаць ізаліраванасць вострава ад усяго свету. Для гэтага ва ўсім афармленні дамініруе вобраз мора, то спакойнага і радаснага, то бушуючага і суровага, то адлюстроўваючага святло месяца, то праменячага сонечнымі блікамі (мастак Ірына Штэнберг).

Мы хочам стварыць мэтаімкнёны, захапляючы спектакль, які выклікаў-бы ў нашым маладым гледачы яшчэ большае імкненне авалодваць ведамі і вопытам, накопленымі чалавецтвам.

Рэжысёр Юрый ПАЛІЧЫНЕЦКІ.

НАСУСТРАЧ СЛАЎНАМУ ДВАЦЦАЦІГОДДЗЮ

20-гадовы юбілей баявога ленінска-сталінскага комсамола — вялікае свята не толькі комсамольцаў і моладзі, але і ўсёй краіны Советаў. Самае шчаслівае ў свеце маладое пакаленне — совецкае сталінскае племя, выхаванае і сагрэтае любоўю і клопатамі большэвіцкай партыі і асабіста правадырамі нашай партыі Ленінымі і Сталіным, — з'яўляецца магутнай актыўнай сілай у будаўніцтве комуністычнага грамадства. Пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі большэвікоў комсамол ператварыўся ў школу рознабаковай дзяржаўнай дзейнасці.

Сыны і дочкі ленінска-сталінскага комсамола гэтак-жа геранчна змагаюцца на перадавых пазіцыях барацьбы за вугаль, за метал, за лепшыя спартыўныя рэкорды, за вышыні сусветнай музыкальнай культуры і г. д., як у годы грамадзянскай вайны геранчна змагаліся за ўладу Советаў на ўсіх франтах. Комсамольцы і моладзь — героі Совецкага Саюза, дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўных Советаў саюзных рэспублік, ордэнаносцы, людзі з сусветным імем — гэта шырока распаўсюджаная з'ява ў нашай краіне. Фёдараў, Шыршоў, Крыванос і Марыя Дземчэнка, Фліер і Гілельс, героі Совецкага Саюза дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР Ерэменка і Юдзін — уся краіна ведае гэтыя імёны лепшых прадстаўнікоў совецкага маладога пакалення.

Багата выдатных людзей выхаваў і наш беларускі пагранічны комсамол. Не гледзячы на ўсе намаганні ворагаў народа, фашысцкіх агентаў прытупіць боездольнасць беларускага комсамола, ЛКСМБ ёсць і будзе адданым большэвіцкай партыі, яе Цэнтральнаму Камітэту, быў і будзе баявым атрадам ленінска-сталінскага комсамола. Шмат комсамольцаў і моладзі ўсенародна абрана 26 чэрвеня ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, у тым ліку малады беларускі кампазітар тав. Багатыроў. У гэтым сказалася давер'е і любоў народа да свайго, маладога сталінскага пакалення. А колькі майстроў беларускай совецкай літаратуры і беларускага совецкага мастацтва выхавана ў комсамоле і комсамолам! Комсамольцы — маладыя пісьменнікі і паэты, акторы і рэжысёры, кампазітары і мастакі — складаюць вялікую таленавітую частку нашай літаратуры і нашага мастацтва.

Наша маладое пакаленне вырастала ў свабоднай краіне. Сталінская Канстытуцыя забяспечвае моладзі шчаслівае жыццё. Усе шырокія дарогі жыцця адкрыты перад маладым чалавекам Совецкай краіны — не трэба блукаць на крывых пуцявінах, каб «выбіцца ў людзі». Не толькі нішто не перашкаджае праяўленню здольнасцей маладога чалавека ў той ці іншай галіне, — наш совецкі лад гарантыруе кожнаму ўступаючаму ў жыццё совецкаму грамадзяніну, што ўсе яго здольнасці будуць беражліва падтрымлівацца, ахоўвацца і развівацца, што яго будуць вучыць і расціць клапатліва і любоўна. Канулі ў нябыт разам з старым праклятым соцыяльным ладам трагедыі беспасажніцы Ларысы, незаконна народжанага Незнамава, «кухаркіных дзяцей», «іншаверцаў»,—усёй той моладзі, якой раней быў закрыт доступ да навукі, жыццё якіх калечыў і ламаў лад, пабудаваны на звярынай эксплаатацыі тунеядцамі працоўнага народа.

Каму абавязана совецкае маладое пакаленне сваім шчаслівым жыццём? Большэвіцкай партыі, Леніну, Сталіну, сваёй соцыялістычнай радзіме. Таму бязмежна любоў і адданасць совецкай моладзі да ленінска-сталінскай партыі, бязмежна любоў і адданасць да сваёй маці-радзімы.

Праяўленнем гэтай сыноўняй любві да радзімы з'явіўся зварот маладых стаханаўцаў і спецыялістаў аўтазавода імя Сталіна да ўсёй совецкай моладзі, надрукаваны 10 чэрвеня ў газеце «Комсомольская правда». Маладыя патрыёты ўзялі на сябе абавязацельства—прыйсці да свята 20-годдзя комсамола з вытворчымі падарункамі і заклікаюць усю совецкую моладзь рыхтаваць такія падарункі.

«Няхай кожны малады грамадзянін СССР у гонар 20-годдзя падрыхтуе і паднясе падарунак сваёй радзіме» — гаворыцца ў звароце. Такім падарункам можа быць новы стаханаўскі рэкорд, новая канструкцыя самалёта ці машыны, новыя творы мастацтва, выдатныя ацэнкі ў вучобе, спартыўныя рэкорды, рэкордныя ўраджаі і многае іншае.

З мільёнаў нашых падарункаў складзецца цудоўны фонд дваццацігоддзя комсамола. Няхай кожны ўнясе пасільны ўклад у залаты фонд скромных і вялікіх спраў, умацоўваючых магутнасць краіны, яе абаронную магутнасць, павышаючых яе культурны ўзровень».

Гэты выдатны пачын аўтазаводаўцаў падхапіла ўжо моладзь усёй краіны. Ужо адгукнуліся комсамольская арганізацыя Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, Тэатр юнага гледача, якія ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы.

Не сумняваемся, што ўсе да аднаго маладыя работнікі літаратуры і мастацтва БССР горача адгукнуцца на гэты заклік і возьмуць на сябе канкрэтныя абавязацельствы—прысці да свята з слаўнымі падарункамі маці-радзіме, з новымі творамі літаратуры і мастацтва, з творамі, вартымі гэтага свята. Яны павінны напісаць новыя паэмы і песні, аповесці і п'есы, стварыць новыя музычныя творы, творы скульптуры і жывапісу, новыя спектаклі і ролі, дзе маладыя пісьменнікі і мастакі разгорнуць усе свае здольнасці, праявяць усю сваю любоў да радзімы.

Вельмі мала і слаба яшчэ паказаны ў нашых творах жыццё і вобразы маладога пакалення нашай краіны. Слаба паказана баявая гісторыя комсамола, беларускага комсамола ў прыватнасці. Не ўзнялі нашы пісьменнікі і мастакі такой тэмы, як геранчная барацьба комсамола за Совецкую Беларусь у часы белапольскай акупацыі. Барацьба комсамола з ворагамі народа, баявая гатоўнасць комсамола ў любы момант стаць на абарону любімай радзімы, — усё гэта павінна яшчэ знайсці мастацкае адлюстраванне ў нашай літаратуры і нашым мастацтве.

Створым да 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола на сцэне, у кіно, у літаратуры жывыя вобразы людзей маладога сталінскага пакалення такой-жа праўдзівасці і мастацкай сілы, як вобраз Паўла Карчагіна ў рамане пісьменніка-большэвіка Нікалая Астроўскага!

Вялікую работу павінны прарабіць комсамольскія арганізацыі мастацкіх устаноў па прапрацоўцы звароту аўтазаводаўцаў сярод комсамольцаў і несаюзнай моладзі.

ЦК ВЛКСМ, адзначыўшы вялікае палітыка-выхаваўчае значэнне прапановы аўтазаводаўцаў, папярэдзіў комсамольскія арганізацыі, «каб гэтая важнейшая справа не была ператворана ў пустую шуміху, у парадпасць»; комсамольскія арганізацыі і друк павінны штодзённа сачыць за выкананнем кожным узятых на сябе абавязацельстваў.

Комсамольскія арганізацыі ў тэатрах і ў Упраўленні па справах мастацтваў павінны звярнуць асаблівую ўвагу на тое, каб маладыя акторы, якія бяруць на сябе абавязацельствы стварыць да свята тыя ці іншыя ролі, маглі гэтыя ролі атрымаць. У практыцы нашых тэатраў яшчэ не зжыта кансерватыўная традыцыя, калі адказную ролю баяцца даверыць маладому актору, тады як на практыцы гэты здольны актор паказаў, што ён добра справіцца з радам адказнейшых вобразаў у спектаклях.

Асабліва адказная задача стаіць перад нашымі пісьменнікамі. Гэта — задача напісання п'ес і сцэнарыяў на тэмы жыцця і змагання совецкай моладзі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі за соцыялізм. Стварэнне такіх п'ес і сцэнарыяў дасць магчымасць нашым тэатрам і кіностудыі стварыць спектаклі і кінофільмы пра маладое пакаленне краіны соцыялізма.

Прынясём нашай соцыялістычнай радзіме ў падарунак новыя творы літаратуры і мастацтва, якія яшчэ вышэй падымуць культуру краіны соцыялізма, якія будуць клікаць увесь совецкі народ з яшчэ большым энтузіязмам аддаваць усе свае сілы і здольнасці на рост сваёй соцыялістычнай радзімы, на ўмацаванне яе абароннай магутнасці, на беззаветную барацьбу за вялікую непераможную справу Леніна—Сталіна!

А. Якімовіч

ПАСТУШКІ

(АПАВЯДАННЕ З ЧАСОЎ ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ).

Трое пастушкоў пасвілі кароў на беразе рэчкі. Яны плялі ракітавыя кошыкі і гутарылі між сабой. Старэйшы з пастушкоў, Юзік, дапытваўся ў меншага, Боліся, ці пайшоў-бы ён на вайну.

— Не ведаю... — нерашуча адказваў Болісь.—Калі-б мама пусціла...

— Твая мама не пусціць. Ого! — ківаў галавою трэці пастушок, Міхалка, стругаючы тонкую спіцу.

— А без мамы? — не адставаў Юзік, які заўсёды толькі і гаварыў пра вайну.

— Не ведаю... Можа-б...

— А я пайшоў-бы!—з гонарам перавагі над таварышам хваліўся Юзік.

— Дык чаму не ідзеш? — злавіў яго на слове Болісь.

— А хто возьме такога? — Юзік задумаўся. — Э, каб гадкоў з пяць яшчэ—пайшоў-бы! Дабравольцам! На вараным жарабцы ездзіў-бы, як дзядзька Максім, — з пікай, з сабляй і з рэвальвертам пры боку. Калоў і сек-бы паноў тоўстапузых...

— І не баяўся-б? — перапыніў яго Болісь.

— А чаго баяцца? Я чуў, Максім расказваў, як ён з іхнім панскім генералам з'ехаўся...

— Ну? Страшна, мусіць?..

— Чаго?—паважна адказаў Юзік. — Генерал, кажа, заскрэгатаў на яго і нацэліўся з рэвальверта. А Максім яму сабляй па руцэ—трах! А потым яшчэ па галаве, — тут яму і капут!

Юзік з такім захапленнем апавядаў пра здарэнне з дзядзькам Максімам, што здавалася, усё гэта было з ім самім. Ён павышаў голас, размахваў рукамі, паказваў, як нацэліўся генерал на Максіма і як Максім трахнуў яму сабляй па руцэ, а потым — па галаве.

Раптам зусім выразна даляцеў да хлапцоў гарматны стрэл. Пастушкі спалохана пераглянуліся.

— З гарматы бабахнулі, — сказаў Міхалка.

— Блізка як,—амаль шэптам дадаў Болісь. — Учора яшчэ толькі гуло, як пад зямлёй.

— Мусіць, нашы адступаюць, — з трывогай у голасе прагаварыў Юзік. — Эх, каб у чырвоных было гэтульк гармат і зброі, як у белых!

— А ў белых адкуль гарматы? — запытаўся Міхалка.

— Ім буржуі даюць. Тата казаў: чатырнаццаць буржуйскіх дзяржаў ваюе супроць нас.

— Аж чатырнаццаць дзяржаў!

— Каб адзін на адзін,—даўно-б панам капут. Але ім і так будзе капут. Нашы пераможуць. Чырвонай Арміі дапамагаюць партызаны і ўвесь народ. Тата кажа: дзе толькі белым удаецца захапіць нашу зямлю, там адразу растуць партызанскія атрады. Вось белякам і крута прыходзіцца... Спераду — чырвоныя, а ззаду — партызаны. Нябось, доўга не наваююць. І гарматы буржуйскія не памогуць.

Юзікаву прамову спыніў вінтовачны стрэл у кустах.

— Чуеце?

— Чалавек сюды бяжыць... — першы ўбачыў Міхалка.

— Мусіць, у яго стралялі?

— Браткі, — усхапіўся Юзік, — гэта-ж дзядзька Клімовіч, старшыня рэўкома!

З боку кустоў паўз рэчку, проста на хлапцоў, бег чалавек. Каля пастушкоў ён прыпыніўся і аглянуўся назад, цяжка дыхаючы.

— Дзядзька Клімовіч, куды вы? — спытаўся Юзік.

— За мною пагоня белапалякаў, — хутка прагаварыў дзядзька Клімовіч, аглядваючыся ў бок кустоў. — Скажыце, рэбяткі, ім, што я пабег далей. А я тымчасам тут у сітняку ў рэчцы перачакаю. Добра?

— Хутчэй, хутчэй! Мы скажам, — замахаў рукою Юзік.

Толькі дзядзька Клімовіч паспеў ускочыць у сітняк, як з кустоў паказаліся два белапалякі з вінтоўкамі ў руках. Убачыўшы пастушкоў, яны таксама кінуліся да іх.

— Гэй, шчаняты! Большэвіка тут не бачылі? — зарычаў адзін з іх, што дабег першым.

— Каго? — нібы нічога не ведаючы, спакойна перапытаў Юзік.

— Большэвіка,—псякрэў!—ужо ледзь не зароў белапаляк ад злосці.

— Вунь туды пабег нехта, а хто—большэвік, ці не — не ведаем, — упэўнена супакоіў яго Юзік.

— Не маніце, холяра! — падскочыў другі белапаляк.

— Берагам пабег, — пацвердзіў і Міхалка.

— Ну, калі што—пастраляем! Псякрэў!

— Навошта нас страляць? Мы вам нічога не зрабілі, — сказаў Юзік.

— Мільч!—белапаляк замахнуўся і хвастануў Юзіка нагайкай.

— Кінь, Бронек! Бяжым! А то з-за іх большэвік уцячэ, — умяшаўся другі белапаляк, і яны пабеглі берагам далей.

— Ну, паны чортавы! — пагразіўся ўслед ім Юзік, трымаючыся за шчаку,—яшчэ паглядзім, хто каго пастраляе! Дзядзька Клімовіч, вылазьце!

Клімовіч, увесь мокры, падышоў да хлапцоў.

— Малайцы! — ён шчыра паціснуў пастушкам рукі, — не падвялі. Дзякуй, рэбяткі!

— Як-жа вы сюды?.. — спытаўся Юзік.

— Белапалякі неспадзявана нарваліся на мястэчка. Я ўцякаў на кані. Усе патроны выпусціў, а яны — не адстаюць. Мусіць, нехта сказаў, хто я такі. Ну, пад'ехаў да балота, кінуў каня ды ў кусты. І яны за мною! Гэта што—ударылі цябе?

— Глупства,—адказаў Юзік тонам дарослага. — Не паспеў адскочыцца.

У дзядзькі Клімовіча твар успыхнуў ад чырвані.

— Звяр'ё — не людзі! Дзяцей біць! Ну, нічога, сынку, пацярпі. Доўга яны не пагуляюць у нас,—суцяшаў ён Юзіка. — Вось што, рэбяты: мне заставацца тут нельга, але ў мяне ёсць для вас адно вельмі важнае даручэнне. Выпаўніце?

Клімовіч уважліва глядзеў у вочы старэйшаму пастушку, Юзіку.

— Што вы, дзядзька Клімовіч, не верыце нам,—ледзь не з крыўдай адказаў Юзік.

— Бачу, што вам можна верыць, таму і хачу даць такое даручэнне.

— Ды мы, дальбог... — горача сказаў Міхалка.

— Мы ўсё зробім для вас,—прасіўся Юзік.

— Дык вось што, рэбяткі: хто-небудзь збегайце ў мястэчка, знайдзіце каваля Хацкеля і скажыце, што я буду чакаць яго ў пушчы каля возера.

— Я ведаю каваля Хацкеля,—радасна сказаў Юзік.

— Дык ты мо' і збегай. А то ўдвух, каб весялей было. Вы малыя, вас ніхто не затрымае.

— Хадзем, Міхалка. А ты, Болісь, папасві адзін. Да вечара вернемся.

— Добра,—неахвотна згадзіўся Болісь. Яму таксама хацелася-б пабегчы ў мястэчка.

— Ну, бяжыце, рэбяткі, шчаслівай вам дарогі! Прагонім белапалякаў, прыеду да вас з гасцінцамі.

***

Праз некаторы час пастушкі зноў сустрэліся з Клімовічам.

Разбітыя Чырвонай Арміяй белапалякі каціліся да Варшавы. Па дарозе з-за кожнага дрэва і куста на іх глядзелі дулы партызанскіх вінтовак і рэвальвераў.

Аднойчы, пасвячы кароў на тым-жа беразе рэчкі, пастушкі ўбачылі, як з іхняга сяла нібы шалёныя імчаліся белапалякі. За імі чуваць былі стрэлы. Зацікаўленыя пастушкі не выцярпелі і ціхком кустамі падбеглі да дарогі, каб разглядзець ясней, што там робіцца. Вось у гэты час яны і ўбачылі дзядзьку Клімовіча. Ён бег па слядах белапалякаў, часта прысядаў на калена і страляў. За ім бегла шмат мужчын—увесь яго партызанскі атрад.

— Дзядзька Клімовіч!—радасна закрычаў Юзік.

Клімовіч на момант спыніўся.

— А, гэта вы! Старыя знаёмыя! Малайцы! Даручэнне выканалі. Дзякую. А гасцінцы потым прывязу. Цяпер няма калі... Вось бачыце!

І ён пабег наперад, расчырванеўшыся, усхваляваны, гонячы перад сабою белапольскіх бандытаў.

М. К. Дабрынін

НІКАЛАЙ ГАЎРЫЛАВІЧ ЧЭРНЫШЭЎСКІ

(ДА 110-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)

Но любит он возвышенней и шире,
В его душе нет помыслов мирских
Жить для себя возможно только
в мире,
Но умереть возможно для других.
(Некрасов).

Нікалай Гаўрылавіч Чэрнышэўскі нарадзіўся 12 ліпеня 1828 года ў Саратаве ў сям'і протаіерэя.

Эпоха, калі разгарнулася дзейнасць Н. Г. Чэрнышэўскага, прадстаўляе вельмі складаную карціну барацьбы грамадска-палітычных групіровак. Цэнтральнымі пытаннямі эпохі былі пытанні аб прыгонным праве, аб рэволюцыі, аб шляхах развіцця Расіі.

Чэрнышэўскі выступае перад намі як рэволюцыйны дэмакрат, як прадстаўнік гістарычнай тэндэнцыі, як правадыр «маладой Расіі». Ён і быў такім правадыром. Вакол яго групіраваліся рэволюцыйныя сялянскія дэмакраты, а рэволюцыянеры ўвесь час лічылі яго сваім правадыром і некалькі разоў спрабавалі гвалтоўна вызваліць яго ў часе ссылкі ў Сібіры. З усяго сказанага ясна роля Чэрнышэўскага ў барацьбе эпохі. Узнікае пытанне, чаму-ж ён займаўся літаратурай, а не толькі соцыяльна-эканамічнымі праблемамі?

Чэрнышэўскі несумненна лічыў, што руская літаратура павінна адыграць вялікую вызваленчую ролю. Гэту-ж думку пазней сустракаем мы і ў яго саратніка Н. А. Дабралюбава, а яшчэ раней яна была выказана Белінскім у пісьме да Гогаля. Усе шляхі былі закрыты і толькі праз літаратуру можна было правесці новую думку. Вось чаму работа на арэне літаратуры і журналістыкі набывае такое вялікае значэнне. Вось чаму так ярка расцвітае журналістыка і гэткі страсны, шырокі і разлютаваны характар барацьбы ў 60-я годы.

Па сваіх філасофскіх поглядах Чэрнышэўскі быў матэрыяліст. Ён быў паслядоўнікам нямецкага філасофа Л. Фейербаха. Яго светапогляд склаўся з тых-жа трох элементаў, з якіх склаўся марксізм. Класічная нямецкая філасофія (Гегель, Фейербах), утапічны французскі соцыялізм (Фур'е) і англійская палітычная эканомія (Рыкарда і Сміт) увайшлі ў светапогляд Чэрнышэўскага. Чэрнышэўскі развіваўся ў тым-жа кірунку, як Маркс і Энгельс, але вузкасць грамадскіх адносін у Расіі 40—60 год, адсутнасць пролетарыята, сялянскі характар краіны не далі яму магчымасці дапрацавацца да тэорыі дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізма, да марксізма. Мы таму можам сказаць, што, не будучы марксістам, Чэрнышэўскі быў папярэднікам марксізма ў Расіі. У гэтым яго глыбокае гістарычнае значэнне.

Маркс надзвычай высока цаніў Чэрнышэўскага, называючы яго вялікім рускім вучоным, а Ленін у многіх месцах падкрэсліваў яго ролю і значэнне ў гісторыі як філасофа, як тактыка, як палітыка, як вучонага.

Чэрнышэўскі меў стройны светапогляд, аб'яднаны адзінствам метаду, адзінствам філасофскага пункту гледжання. Не гледзячы на тое, што матэрыялізм Чэрнышэўскага быў не дыялектычны, а механістычным, ён усё-ж быў досыць вострай і моцнай зброяй у барацьбе супроць усякіх ідэалістычных і метафізічных сістэм. Заснаваная на гэтым матэрыялізме эстэтычная сістэма аказалася добрай зброяй для барацьбы супроць рэлігійных, ідэалістычных, метафізічных тэорый і поглядаў у галіне мастацтва. Сваю эстэтычную тэорыю Чэрнышэўскі выклаў у дысертацыі «Эстэтычныя адносіны мастацтва да рэчаіснасці».

Даўшы сваё вызначэнне прыгожага, ён падвергнуў рэзкай крытыцы ўсе існаваўшыя погляды ідэалістаў на гэта пытанне. Вывады, да якіх прышоў Чэрнышэўскі, наступныя:

«Сапраўднае вызначэнне прыгожага гэткае: прыгожае ёсць жыццё; прыгожай істотай здаецца чалавеку тая істота, у якой ён бачыць жыццё, як ён яго разумее; прыгожы прадмет — той прадмет, які напамінае яму аб жыцці».

Але так як у розных класаў жыццё рознае, дык і разуменне аб жыцці, значыць, разуменне аб прыгожасці таксама рознае. Тое, што здаецца прыгожым паселяніну, не да спадобы прадстаўніку вышэйшых класаў і наадварот. Гэтым палажэннем сцвярджаецца залежнасць мастацтва ад жыцця розных соцыяльных груп.

Рэчаіснасць не толькі жывей, але і дасканалей фантазіі. Вобразы фантазіі — толькі бледная і амаль заўсёды няўдалая пераробка рэчаіснасці.

«Галіна мастацтва не абмяжоўваецца галіною прыгожага ў эстэтычным сэнсе слова, прыгожага па жывой сутнасці сваёй, а не толькі па дасканаласці формы: мастацтва ўзнаўляе ўсё, што ёсць цікавага для чалавека ў жыцці».

Гэтымі тэзісамі сцвярджаецца не толькі матэрыялізм у мастацтве, мастацтва не толькі становіцца ніжэй жыцця, але яно падпарадкоўваецца практычным патрэбнасцям. Сцвярджэннем — узнаўляе ўсё, што цікава, зноў падкрэслівалася важнасць тых бакоў жыцця, якія павінны быць аб'ектамі для паказу.

Узнаўленне жыцця — агульная характарыстычная адзнака мастацтва, якая складае сутнасць яго; часта творы мастацтва маюць і другое значэнне — тлумачэнне жыцця; часта маюць яны і значэнне прыгавору аб з'явах жыцця.

Тут аўтар падвёў вынік, што мастацтва ўзнаўляе жыццё, мастацтва тлумачыць жыццё, мастацтва з'яўляецца прыгаворам над з'явамі жыцця.

Два першых палажэнні не патрабуюць каментарыяў, а аб трэцім трэба сказаць, што, высоўваючы яго, Чэрнышэўскі ставіў вялікую задачу перад мастацтвам. Ён патрабаваў, каб мастак выказваў свае адносіны да паказваемых ім фактаў жыцця.

Эстэтычная тэорыя Чэрнышэўскага была прынята варожа. Усе ўгледзелі ў ёй паслядоўны матэрыялізм, які пранікнуў у апошнюю галіну ідэалізма — мастацтва. І, паўтараю, не гледзячы на тое, што гэта быў яшчэ недасканалы матэрыялізм, ён быў ужо непераможнай зброяй супроць ідэалістаў, містыкаў, метафізікаў. На эстэтычнай тэорыі былі абгрунтаваны прынцыпы крытыкі.

З усяго сказанага мы можам зрабіць вывад, што «літаратурная крытыка не займае асноўнага месца ў дзейнасці Чэрнышэўскага, але сам Чэрнышэўскі займае віднейшае месца ў гісторыі крытыкі» (А. Луначарскі).

Адзначым прынцыпы яго крытыкі.

Матэрыялізм. З'явы літаратуры Чэрнышэўскі разглядаў у сувязі з парадзіўшай іх матэрыяльнай глебай. Толькі тое дасягае развіцця, што знаходзіцца ў жывой сувязі з патрэбнасцямі грамадства. «Тое, што не мае карэнняў у глебе жыцця, застаецца вялым і бледным»...

Гістарызм. У аснове крытычнага падыходу Чэрнышэўскага ляжыць паслядоўны гістарызм, але не ў якасці простай храналагічнай паслядоўнасці, а ў якасці дэтэрмінізма. Разважаючы аб Белінскім, Чэрнышэўскі пісаў, што характар яго крытыкі проста залежаў ад гістарычнага становішча. «Будзь ён не такім, гэта непахісная гістарычная неабходнасць знайшла-б сабе другога служыцеля, з другім прозвішчам, з другімі рысамі, але не з другім характарам».

«Час патрабуе слугі свайго», па глыбокаму выслоўю аднаго з такіх слуг.

Партыйнасць і непрымірымасць. У сваіх ацэнках мастакоў Чэрнышэўскі стаяў на строга вытрыманым пункце гледжання рэволюцыйнага дэмакрата. З пазіцый рэволюцыйнай дэмакратыі ацэньваў ён творчасць мастакоў. У артыкуле аб шчырасці ў крытыцы ён



здекваўся з крытыкаў лібералаў, крытыкаў фразёраў, патрабуючы ад іх выразнасці, яснасці, рэзкасці, непрымірымасці ў разважаннях. «Хто гладзіць па шэрсці ўсіх і ўсё, той акрамя сябе не любіць нікога і нічога; кім задаволены ўсе, той не робіць нічога добрага, таму што дабро немагчыма без знявагі зла; каго ніхто не ненавідзіць, таму ніхто нічым не абавязаны».

Эстэтычны прынцып. Чэрнышэўскі следам за Белінскім патрабаваў, каб у кожным мастацкім творы эстэтычныя накіраванні зліваліся з грамадскімі. Значэнне і роля мастацкага твора залежыць ад важнасці і шырыні адлюстроўваемай рэчаіснасці, ад глыбіні пранікнення ў яе, ад жывасці, г. зн. якасці вобразнага адлюстравання.

Эстэтычная вартасць твора тым вышэй, чым больш яна значыць, як факт грамадскі. Мастацкасць вынікае ад спалучэння розуму з несвядомай творчай сілай, што можа быць выражана як: 1) веданне рэчаіснасці, 2) адушаўленне яе, г. зн. адносіны жывой любві і нянавісці, 3) уменне надаваць свайму твору прастату.

Гэтыя прынцыпы крытыкі былі бліскуча раскрыты на аналізе твораў раду пісьменнікаў: А. С. Пушкіна, Гогаля, Астроўскага, Шчэдрына, Л. Талстога, Н. Успенскага, Бенедыктава, Н. Огарэва, Некрасава і інш. Ацэнкі Чэрнышэўскага ўладаюць здзіўляюча тонкімі назіраннямі над творчасцю пісьменнікаў і яе глыбокім прагнозам. Асабліва здзіўляюча гэта зроблена ў адносінах да Л. Талстога. «Мы прадракаем, — пісаў у заключэнні артыкула Чэрнышэўскі, — што ўсё, дадзенае да гэтага графам Талстым нашай літаратуры, толькі зарука таго, што зробіць ён пазней; але якія багатыя і выдатныя гэтыя зарукі».

Геніяльная фігура Н. Г. Чэрнышэўскага была-б акрэслена няпоўна, калі-б мы не ўзялі яго як мастака. Эстэтычныя погляды, разуменне мастацкасці, задач і мэт мастацтва, атрымаўшыя тэарэтычную фармуліроўку ў яго дысертацыі, атрымалі мастацкае афармленне ў яго раманах. З іх самы важны «Что делать?». Раман быў напісан у казэмаце Петрапаўлаўскай крэпасці з 14.XII—1862 па 4.IV—1863 год. З'явіўся раман у журнале «Современник» за 1863 год — у красавіку і маі. Адносіны да рамана былі самыя рознастайныя — ад рэзка адмоўнага (Фет, Тургенеў і інш.) да захапляючага (разначынцы). Не маючы магчымасці характарызаваць барацьбу вакол рамана, напамінаем водгук аб ім Г. В. Плеханава.

«Няхай укажуць нам хоць адзін з самых выдатных сапраўды-мастацкіх твораў рускай літаратуры, які па свайму ўплыву на маральнае і разумовае развіццё краіны мог-бы паспрачацца з раманам «Что делать?». Ніхто не ўкажа такога твора, таму што яго не было, няма і, напэўна, не будзе. З таго часу як завяліся друкарскія варштаты ў Расіі і аж да нашага часу ні адзін друкаваны твор не меў у Расіі такога поспеху, як «Что делать?».

Гэты водгук упаўне адпавядае гістарычным фактам. Асноўная ідэя рамана — ідэя соцыяльнага перавароту, соцыялізма, пераробкі ўсяго грамадства на новых пачатках. Ідэя гэта пайшла па трох кірунках: соцыяльна-эканамічнаму (наладжванне вытворчых асацыяцый з завяршаючай карцінай соцыялізіраванай працы ў чацвертым сне Веры Паўлаўны), палітычнаму (падрыхтоўка рэволюцыі з цэнтральным вобразам Рахметава) і сямейна-бытавому (становішча жанчыны, свабодная любоў, шлюб, сям'я). Такім чынам, рэволюцыя чалавечых адносін ва ўсёй сваёй паўнаце, уключаючы пытанне аб светапоглядзе, маралі, любві, формах сям'і і шлюбу, аб розуме і яго ролі, — уваходзіць у змест рамана «Что делать?».

У рамане варта адзначыць тры моманты: арганізацыя майстэрняў Верай Паўлаўнай, наладжванне сямейнага жыцця, пастаноўка пытання аб рэволюцыі. Усе яны сказваюцца ў снах Веры Паўлаўны.

Сны Веры Паўлаўны і ў асаблівасці чацверты — самае выдатнае месца ў рамане, што сцвярджаў яшчэ Герцэн. Тут з найвялікшай паўнатой раскрыта ідэя рамана. Сярод вобразаў вылучым вобраз Рахметава — тып будучага рэволюцыянера 70-год, які ўсяго сябе прысвяціў справе рэволюцыйнай барацьбы. Гэта не звычайны чалавек. Аб ім Чэрнышэўскі пісаў:

«Дык бачыш-жа, пранікліва чытач, гэта я не для цябе, а для другой часткі публікі гавару, што такія людзі, як Рахметаў, смешныя. А табе, пранікліва чытач, я скажу, што гэта не благія людзі. Мала іх, але імі расцвітае жыццё ўсіх, без іх яна заглохла-б, пракісла-б; мала іх, але яны даюць усім людзям дыхаць, без іх людзі задыхнуліся-б. Вялікая маса чесных і добрых людзей, а такіх людзей мала; але яны ў ёй — тэін у чаі, букет у благародным віне; ад іх яе сіла і арамат; гэта цвет лепшых людзей, гэта рухавікі рухавікоў, гэта соль солі зямлі» (195).

Асабліва цікавы вобраз рускай жанчыны 60-х год XIX стагоддзя — Веры Паўлаўны. У гэтым вобразе Чэрнышэўскі вырашыў найцяжэйшую праблему любві, сям'і, шлюбу і грамадскай дзейнасці. «Хто не паспытаў, як абуджае любоў усе сілы чалавека, той не ведае сапраўднай любві»... «Толькі той любіць, хто дапамагае любімай жанчыне ўзнімацца да незалежнасці»—гаворыць Вера Паўлаўна і гэтымі думкамі выказвае ясны погляд на любоў. Жанчына павінна быць свабодна і незалежна ў сваёй любві, у сям'і, у адносінах да грамадства, яна раўнапраўны член грамадства. Гэтыя думкі сцвярджае Чэрнышэўскі вобразам Веры Паўлаўны. Радасць жыцця, радасць любві, працы, грамадскай дзейнасці сцвярджае Чэрнышэўскі ў сваіх раманах. Бадзёры жыццёрадасны настрой, паўната жыццёадчування і ўпэўненасць у перамозе соцыялізма — асноўны настрой мастацкіх твораў Чэрнышэўскага.

І ў гэтым выключнае грамадскае значэнне яго раманаў. Цэлыя пакаленні моладзі вучыліся жыць і думаць не толькі па тэарэтычных работах Чэрнышэўскага, але па яго раману «Что делать?»

***

З усяго сказанага лёгка зрабіць вывад аб тым велізарным гістарычным значэнні, якое меў у гісторыі развіцця рускай грамадскай думкі, рускай крытыкі, рускай літаратуры, рускай грамадскасці Нікалай Гаўрылавіч Чэрнышэўскі — вялікі рускі вучоны, правадыр рэволюцыйнай дэмакратыі 60-х год XIX стагоддзя. Тое, аб чым ён марыў, за што змагаўся, карціны чаго маляваў у сваіх раманах, ажыццяўляецца на нашых вачах у шчаслівай Краіне соцыялізма.

АБ ОПЕРНЫМ ТЭАТРЫ

Пяць год назад з беларускай опернай студыі быў створан Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета.

Арганізацыя і творчы рост тэатра — вялікая заваёва маладой соцыялістычнай культуры БССР. У тэатры выраслі кваліфікаваныя беларускія кадры опернага і балетнага мастацтва. Створаны оперныя і балетныя спектаклі, якія паказваюць, што нашы спевакі і танцоры пастуnова авалодваюць майстэрствам свайго мастацтва.

Але дасягненні нашага тэатра былі-б куды большымі, калі-б не подлая падрыўная работа ворагаў народа, якія сядзелі ва Упраўленні па справах мастацтва, якія раней, і пры арганізацыі тэатра, імкнуліся «давесці», што ў нашай рэспубліцы не можа вырасці тэатр оперы і балета, а пасля арганізацыі тэатра ўсімі мерамі дэзарганізавалі яго работу, імкнуліся звесці тэатр са шляху соцыялістычнага рэалізма.

У апошні год, калі перад Тэатрам оперы і балета была пастаўлена адказнейшая задача падрыхтоўкі да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, ворагі народа, сядзеўшыя ва Упраўленні, асабліва актывізаваліся, каб сарваць работу тэатра. Нездарма-ж тэатр за апошні год сваёй работы прышоў у сапраўдны тупік. Год працы калектыва ў некалькі сот чалавек прывёў да такога мізэрнага творчага выніку, як малаўдалыя пастаноўкі оперы «Ціхі Дон» і балета «Марная перасцярога» ў самым канцы сезона. Восем месяцаў тэатр наогул не паказваў гледачу сваёй работы, ён пачынаў работу над операмі, не даводзіў яе да канца («Еўгеній Онегін», «Бахчысарайскі фантан», «Царская нявеста») і работа гінула дарма; бясплянавасць, незагружанасць работнікаў прывялі да раду надзвычай ненармальных з'яў у самым калектыве. Зразумела, што акрамя ўсяго такая «работа» тэатра каштавала дзяржаве велізарную суму грошай.

Прызначаны год таму назад дырэктарам і мастацкім кіраўніком тэатра Ф. А. Ярыкаў нясе поўную адказнасць за год дэзарганізаванай, бясплоднай работы тэатра.

Супроцьстаўленне Ярыкавым самога сябе ўсяму творчаму калектыву тэатра прывяло да поўнага адрыву ад масы работнікаў. Замест таго, каб абаперціся на лепшыя творчыя сілы тэатра, Ярыкаў абкружаў сябе групкай падхалімаў, сумесна з якой пачаў весці агідную палітыку шэльмавання сумленных, але няўгодных яму работнікаў. Так былі ашэльмаваны і выгнаны з тэатра галоўны дырыжор Акулаў, галоўны рэжысёр Смоліч, Васільеў і іншыя, былі абвешчаны «варожай групіроўкай» і самым агідным чынам падвяргаліся цкаванню таварышы Дзянісаў, Друкер, Каліноўскі і многія іншыя. Ярыкаў фактычна вымусіў тав. Друкер падаць заяву аб выхадзе з тэатра. Кампазітар Багатыроў таксама быў абвешчан Ярыкавым членам «варожай групіроўкі», абвінавачан ім у цяжкім грэху — ён, Багатыроў, хадзіў да Акулава на кватэру... Былі вымушаны пакінуць тэатр крытыкаваўшыя дзейнасць Ярыкава тт. Шахрай, Таланкін, вырасшыя ў нашым тэатры тт. Бароўскі і Балоцін, быў звolен добры, кваліфікаваны артыст тав. Лявіцкі, якому былі «прышыты» завeдама ложныя ярлыкі, а калі нарсуд аднавіў Лявіцкага на рабоце, Ярыкаў знайшоў спосаб зволіць яго ў другі раз, хоць гэта сур'ёзна адбілася на якасці спектакля «Ціхі Дон». Зараз ЦК саюза прапмастацтваў прапанаваў аднавіць тав. Лявіцкага на рабоце і дырэкцыя павінна заплаціць яму за вымушаны прагул вялікую суму грошай. Таксама незаконна зволенаму Ярыкавым і адноўленаму на працы загадам Усесаюзнага Камітэта па справах мастацтваў тав. Ліневічу тэатр вымушан выплаціць пяць тысяч рублёў за вымушаны прагул. Ярыкаў разагнаў кваліфікаваных работнікаў тэатра, замяняючы іх такімі, галоўная якасць якіх — «вернасць» яму, Ярыкаву (Шварц, Хайлаў, Белоў і інш.).

На апошнім сходзе работнікаў тэатра, які доўжыўся чатыры дні, сярод шматлікіх абураючых фактаў дзейнасці Ярыкава былі ўскрыты і такія: ён выклікаў у габінет людзей (Белова, Матусевіча) і прапаноўваў ім падбіраць кампраметуючы матэрыял на тых, хто крытыкаваў работу гэтага гора-кіраўніка.

Штучна ствараўся антаганізм паміж беларускімі нацыянальнымі кадрамі тэатра і таварышамі, прыехаўшымі з братніх рэспублік (палітыка ставак, размеркаванне адказных ролей і г. д.); адносіны Ярыкава да беларускіх кадраў такія, што прымушаюць многіх імкнуцца пакінуць тэатр.

Зволіўшы Акулава і Смоліча, Ярыкаў не патурбаваўся замяніць іх іншымі работнікамі і, такім чынам, амаль год тэатр працаваў без галоўных кіруючых творчых работнікаў, без галоўных дырыжора і рэжысёра. Зразумела тая неразбярыха ў рабоце тэатра, калі на працягу мінулага года пачыналіся многія работы і ні адна не даводзілася да канца; зразумела, што і галоўная задача тэатра — стварэнне арыгінальнага беларускага рэпертуару — аказалася пакуль-што не выкананай, хоць кампазітарамі напісаны ўжо дзве беларускія оперы і балет.

Работа над гэтымі творамі надзвычайна зацягвалася, вялася бясплянава, у выніку чаго можа стацца, што ў оперных тэатрах іншых рэспублік, дзе гэтыя творы прыняты да пастаноўкі, яны могуць быць пастаўлены раней, чым у Беларускім тэатры оперы і балета, для якога ў першую чаргу яны напісаны.

Сістэматычнае парушэнне і змяненне будаўнікамі Вялікага тэатра тэрмінаў сканчэння будаўніцтва ўносіць вялікую дэзарганізацыю ў работу тэатра. Але Ярыкаў і тут не праявіў дзелавой ініцыятыўнасці і настойлівасці, каб фарсіраваць будаўніцтва.

Надзвычайная бясплянавасць у рабоце, пры злачынных адносінах да выдаткавання дзяржаўных сродкаў, прывяла да таго, што велізарныя сумы раздаваліся пад дагаворы, якія не ажыццяўляліся. На пастаноўкі, якія не ўбачылі свету. Гэтая трата дзяржаўных грошай асабліва абурае, калі ўспомніць мізэрны рэзультат работы тэатра за год.

Як-бы ні спрабаваў даводзіць Ярыкаў, што ён «гарыць на рабоце, а калектыў яму не дапамагае» — уся практыка работы тэатра гаворыць аб адваротным: калектыў тэатра сапраўды гарыць жаданнем усе свае сілы і здольнасці аддаць будаўніцтву беларускага совецкага мастацтва, а Ярыкаў з дня ў дзень правальвае ўсю канкрэтную работу тэатра.

Нясе адказнасць за становішча тэатра і партарганізацыя.

Пасля схода, на якім усе работнікі тэатра аднадушна і рэзка крытыкавалі ўсю дзейнасць Ярыкава ў тэатры, прайшло два месяцы, а Ярыкаў працягвае кіраваць тэатрам. Такі кіраўнік можа прынесці зараз вялікую шкоду тэатру — тэатр павінен рыхтавацца к пачатку сезону, павінен укамплектаваць трупу, знайсці галоўнага рэжысёра і галоўнага дырыжора, скласці рэпертуарны план і г. д. Гэты сезон асабліва адказны — Тэатр оперы і балета БССР у 1939 годзе паедзе ў чырвоную сталіцу Маскву дэманстраваць мастацтва нашага народа. Гэта — вялікі гонар для работнікаў тэатра.

Аднак, можна ўпэўнена сказаць, што сучаснае кіраўніцтва не здолее забяспечыць належнай падрыхтоўкі тэатра да адказнага новага рабочага года. Першыя дні работы тэатра пасля адпачынку яскрава сведчаць аб гэтым. Як і раней, пануе поўная неразбярыха; людзі, вяртаючыся з адпачынку, не ведаюць, да якой работы прыступаць. А цяпер надзвычай дораг кожны дзень. Таму нас здзіўляе, чаму камісія ЦК КП(б)Б, якая абследавала работу тэатра, і асабіста старшыня гэтай камісіі тав. Аронаў, зацягваюць рэалізацыю вынікаў абследвання.

Здзіўляе таксама, чаму Усесаюзны Камітэт па справах мастацтваў, які добра ведае становішча ў тэатры, ні чым не рэагіруе на шматлікія заявы работнікаў тэатра. Камітэт не дабіўся выканання свайго загада аб вызваленні Ярыкава ад мастацкага кіраўніцтва тэатрам. Прыязджаўшы сюды і прысутнічаўшы на сходзе калектыва тэатра прадстаўнік Камітэта тав. Розенталь ніякіх вывадаў чамусьці не палічыў патрэбным зрабіць. Раней прыязджаўшыя для абследвання тэатра прадстаўнікі Камітэта тт. Піцерскі і Арлоўскі таксама нічога не зрабілі.

Нам незразумела, чаму без усякіх падстаў быў знят з работы былы дырэктар гэтага тэатра Гантман, заменены з дзіўнай паспешнасцю Ярыкавым.

Усё гэта вымушае нас патрабаваць высвятлення палітычнага твару Ярыкава. Патрабуем таксама высветліць, хто і па якіх прычынах абараняў і абараняе да сёнешняга дня Ярыкава, з прычыны чаго ўсе выступленні работнікаў тэатра, застаюцца безрэзультатнымі.

Дзяржаўны тэатр оперы і балета БССР — вялікі творча працаздольны калектыў, які здолее дастойна прадэманстраваць на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве скарбніцы народнага мастацтва нашай ордэнаноснай рэспублікі. Але тэатр павінен быць забяспечан моцным, кваліфікаваным, сапраўды большэвіцкім кіраўніцтвам. І гэта трэба зрабіць неадкладна.

Кампазітары: дэпутат Вярхоўнага совета БССР А. БАГАТЫРОЎ, М. КРОШНЕР, Е. ЦІКОЦКІ.

Ад рэдакцыі: Друкуючы артыкул тт. Багатырова, Крошнера і Цікоцкага, рэдакцыя выказвае сваё здзіўленне пазіцыяй неўмяшацельства ў справы Опернага тэатра, занятай партарганізацыяй (парторг т. Мельнікаў) і кіраўніцтвам Упраўлення па справах мастацтва. Рэдакцыя спадзяецца, што Кагановіцкі РК КП(б)Б дапаможа партарганізацыі Упраўлення па справах мастацтва заняць большэвіцкую пазіцыю ў гэтым пытанні.

РАБОТА НАД НОВЫМІ БЕЛАРУСКІМІ ОПЕРАМІ

Рад беларускіх кампазітараў працуюць зараз над стварэннем новых беларускіх опер.

Кампазітар Н. Шчэглоў працуе над операй «Кацярына Жарнасек» па аднайменнай п'есе М. Клімковіча. Лібрэта піша аўтар п'есы.

Малады кампазітар П. Падкавыраў у хуткім часе прыступае да работы над комсамольскай операй «Як гартавалася сталь», па аднайменнаму раману пісьменніка-большэвіка Нікалая Астроўскага. Лібрэта, якое піша М. Юдэлевіч, будзе гатова ў верасні. Абодва аўтары—комсамольцы, яны прысвячаюць свой першы оперны твор 20-годдзю ленінскага комсамола.

Аб нямецкай акупацыі на Беларусі мяркуе напісаць оперу кампазітар Н. Аладаў.

Кампазітар Самохін будзе пісаць першую дзіцячую оперу на сюжэт аповесці Якімовіча «Каваль Вярнідуб».

У ЯЎРЭЙСКІМ ТЭАТРЫ БССР

Калектыў Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР з 4 красавіка па 5 мая гастраліраваў у Віцебску, Смаленску, Горкім і Сталінградзе. Гастролі тэатра прайшлі з вялікім поспехам.

Па сканчэнні адпачынку, 10 жніўня тэатр выязджае ў Гомель і Бабруйск, дзе пакажа дзве новыя пастаноўкі «Тэўе—малочнік» — інсцэніроўку па Шолам-Алейхему і новую п'есу «Возакі» артыста Яўрэйскага тэатра БССР А. Левіна. Зімовы сезон тэатр пачне ў Менску 1 кастрычніка.

У рэпертуар тэатра на 1938—39 год уключаны новыя п'есы: «Бар-Кохба» Галкіна, п'еса аб грамадзянскай вайне П. Маркіша і новая п'еса Даніеля «Саламон Маймон».

Э.

КАНЦЭРТЫ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫКІ

З мэтай папулярызацыі беларускай музыкі Саюз совецкіх кампазітараў БССР вырашыў правесці рад сімфанічных і камерных канцэртаў.

Прапанову саюза падтрымала Дзяржаўная філармонія БССР, яна ўключыла ў свой план дзевяць сімфанічных канцэртаў. Калектывы філармоніі выканаюць сімфоніі, сюіты, хоры і песні з аркестрам кампазітараў Туранкова, Багатырова, Залатарова, Аладава, Цікоцкага, Пукста, Шчэглова, Крошнера, Падкавырава, Самохіна, Чуркіна, Шнітмана і Палонскага.

Неабходна, каб Філармонія ўключыла ў свой план таксама рад камерных канцэртаў, складзеных з твораў памянёных кампазітараў, а таксама з твораў кампазітараў Любана, Ефімава, Іванова, Равенскага, Лукаса, Сакалоўскага і Рыбкіна.

Канцэрты адбудуцца на працягу бягучага і 1939 года. Яны шырока азнаёмяць працоўных з творчасцю беларускіх кампазітараў.

„КРАВЕЦКІЯ“

22 ліпеня ў Доме пісьменніка драмсекцыяй ССПБ праведзена абмеркаванне п'есы «Кравецкія», напісанай маладымі драматургамі — журналістам Ю. Рудзько і актoрам У. Стэльмахам.

П'еса адлюстроўвае барацьбу беларускага народа з ворагамі ў соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Абмяркоўваючы гэты твор маладых аўтараў, выступаючыя тт. Чорны, Шынклер, Паслядовіч, Юдэлевіч, Есакоў і Кутневіч адзначылі, што тэма п'есы актуальная, сюжэт яе пабудаван цікава і займальна. Да недахопаў трэба аднесці недастатковую тыпізацыю дзеючых асоб, нежыццёвасць мовы некаторых персанажаў і недапрацаванасць асобных сюжэтных дэталей.

Выступаючыя таварышы рэкамендавалі аўтарам звязацца з тэатрам і ўжо там дапрацаваць сваю п'есу. Прадстаўнік Упраўлення па справах мастацтваў тав. Кутневіч абяцаў дапамагчы ў гэтым. Трэба заўважыць, што Упраўленне не клапоціцца аб рабоце з маладымі драматургамі, не прыцягвае іх да стварэння рэпертуару для калгасна-соўгасных тэатраў.

Пісьмо кампазітара

Паважаны рэдактар!

На працягу доўгага часу я прасіў Саюз кампазітараў БССР дапамагчы мне прыступіць да работы над стварэннем оперы. Яшчэ зімою Тэатр оперы і балета БССР выклікаў мяне ў гор. Менск. Было агаворана, што да мяне прымацуюць лібрэтыста. І з таго часу, не гледзячы на мае настойлівыя просьбы паскорыць афармленне работы, ні Саюз кампазітараў, ні Тэатр оперы і балета, ні Упраўленне па справах мастацтваў нічога не робяць у гэтым напрамку.

Гэтымі днямі на перадвыбарчым сходзе кампазітараў гаварылася, што да мяне прымацуюць лібрэтыста. Прычым указвалася, што паведамлена ўжо тав. А. Куляшову, які знаходзіцца ў Хоцімскім раёне ў адпачынку, каб ён прыступіў да работы над складаннем лібрэта на тэму аб жыцці совецкага калгаса. Рэкамендавалі мне звязацца з тав. Куляшовым. Тав. Куляшоў адказаў мне, што ніхто яму аб прадстаячай рабоце не паведамляў і таму, натуральна, прыступіць да работы ён не можа. Пытанні падрыхтоўкі да прадстаячай дэкады беларускага мастацтва ў Маскве патрабуюць пасілення паваротлівасці адпаведных арганізацый, каб ужо цяпер даць канкрэтныя заданні па стварэнню музыкі, ахапіўшы гэтай работай усіх кампазітараў.

Я прашу вас дапамагчы мне атрымаць канкрэтнае заданне. **Гр. ПУКСТ.**



«Абмен вопытам». Карціна мастака В. Волкава

Беларускія мастакі

Чым характэрны работы беларускіх мастакоў? Можна сказаць, што мастакі нашы ў большасці сваёй усвядомілі парочнасць усякага роду фармалістычных заблуджэнняў, што ў сваёй творчасці яны імкнуцца знайсці найбольш уласцівыя нашай соцыялістычнай эпосе мастацкія вобразы. Зразумела, што працэс гэты вельмі складаны і што на шляхах станаўлення соцыялістычнага рэалізма ў мастацтве побач з поспехамі непазбежны і памылкі і творчыя няўдачы.

З старых беларускіх мастакоў найбольшую цікавасць прадстаўляе В. Волкаў. Карцінам гэтага мастака ўласціва лаканічнасць кампазіцыі, выразнасць формы і некалькі халаднаваты каларыт. Такая, напрыклад, адна з найбольш удалых яго карцін — «Партызаны». Карціна паказвае зімовую ноч і невялікі партызанскі атрад ля кастра ў момант трывогі. Кастра не відаць, ён закрыт постаццю партызана на першым плане, але святло кастра асвятляе ўвесь цэнтр карціны. Малады партызан усхвалявана дакладвае начальніку атрада аб набліжаючымся супраціўніку, паказваючы абодвума рукамі ў левы бок. Твару камандзіра не відаць, мы бачым толькі яго чотка вырысоўваючуюся ў святле кастра насцярожаную поўсагнутую постаць. Адчуваецца, што камандзір атрада слухае і адначасова абдумвае рашэнне. Партызан злева ад камандзіра ўжо ўзяў вінтоўку на плячо. За ім стары партызан, па спакоі якога відаць, што ён гатовы сустрэць любую небяспеку. Гэты настрой перадае і другая група партызанаў справа. І па кампазіцыі і па псіхалагічнай трактоўцы партызанаў карціна ўдалая.

З другіх работ Волкава варта адзначыць яго манументальныя роспісы ў Негарэлым і яго новую работу «Абмен вопытам». Апошняя карціна, хоць і менш удалая па выкананню, чым «Партызаны», але ў ёй Волкаву ўдалося выразіць новыя якасці людзей, перадаць настрой таварыскай вытворчай спайкі паміж старымі і маладымі рабочымі, натуральную сур'ёзнасць маладых рабочых, з якой яны вучацца тэхніцы ў старога рабочага.

Што-ж датычыцца каларыту ў карцінах Волкава, дык каларыту гэтаму ўласціва досыць абмежаваная гамма фарбаў і, як ужо гаварылася, халаднаватыя тоны. Гэту халоднаватасць тонаў некаторыя схільны разглядаць як акадэмічную слабасць мастака, але гэта памылковая думка. Гісторыя ведае не так багата мастакоў, якія адначасова былі і добрымі рысавальшчыкамі і каларыстамі.

У сваіх карцінах Волкаў імкнецца да найбольшага выяўлення вобразаў паказваемых герояў, для чаго ён умее знайсці і кампазіцыю, і выразную форму, і адпаведную псіхалагічную трактоўку, чаго нехапае ў некаторых нашых беларускіх мастакоў. Для гэтага Волкаў у дастатковай меры валодае і каларытам. Праўда, дабіваючыся выяўлення галоўнага і характэрнага ў карціне, Волкаў упадае часам у небяспечныя крайнасці.

Калі ў «Абмене вопытам» Волкаву, дзякуючы пошукам лакальнага колеру, удалося сцісла і проста выразіць шэравата-блакітнымі тонамі найбольш спецыфічныя для стругальнага цэха скуранога завода колеры, дык у карціне «Плытагоны» таго-ж Волкава гамма фарбаў аказалася як-бы «ўзарванай». Мастак, імкнучыся да некаторай сімволікі, апрануў плытагона ў чырвоную кашулю, тады як уся карціна вырашана ў больш светлых тонах. У рэзультаце гэта яркая кашуля, вырашаная па-за агульным каларытам, сапсавала ўсю карціну.

Аб карціне «Абмен вопытам» трэба яшчэ сказаць, што гэта пакуль-што лепшае, што створана беларускімі мастакамі на тэмы з вытворчага жыцця. На апошняй выстаўцы дэманстравалася вялікае палатно мастака Я. Кругера «Кавальскі цэх». Кругер не змог па-новаму асэнсаваць вытворчы працэс, знайсці і падкрэсліць тыя новыя якасці, якія ўласцівы толькі совецкім людзям. «Кавальскі цэх» Кругера — гэта фатаграфія і да таго-ж вельмі няўдалая. Карціна паказвае цэх ва ўсіх дэталях натуралістычна. Ні дынамікі, ні фарбаў. Людзі быццам-бы застылі каля горнаў. Карціна проста мёртвая. Кругер вопытны мастак, з вялікай культурай, але гэта карціна яму зусім не ўдалася.

Упаўне зразумела і пахвальна цяга беларускіх мастакоў да гісторыі беларускага народа. Але за выключэннем памянёнай вышэй карціны «Партызаны» Волкава ў нас пакуль-што няма другіх каштоўных палотнаў на гэту тэму. На апошняй выстаўцы паказваліся палотны мастакоў І. Ахрэмчыка і М. Манасзона на тэму ўступлення Чырвоных войск у Менск, але абодвы гэтыя работы далёка не даюць належнага вырашэння тэмы. Бяда не толькі ў слабай жывапіснай тэхніцы, але перш за ўсё ў сюжэтнай непісьменнасці гэтых карцін.

Манасзон загрувасціў сваю карціну войскамі, на першы план вынес дзве групы: жанчыну з дзіцём на руках, якая гутарыць з чырвонаармейцам, і работніцу, якая частуе чырвонага кавалерыста халоднай вадой. Злева паказана асноўная група сустракаючых.

Жадаючы падкрэсліць цяжар белапольскага гнёту, перажытага насельніцтвам горада, Манасзон паказаў сустракаючых настолькі змардаванымі, што, здаецца, яны нават не могуць усміхацца. Фарбы аказаліся настолькі згушчонымі, што сам замысел перайшоў у сваю супроцьлегласць: радасць сустрэчы аказалася расхаладжанай. Мастак імкнуўся сказаць вельмі многае, а ў рэзультаце амаль нічога не сказаў. Куды-б было разумней і лепш перадаць на карціне сапраўдную і непасрэдную радасць сустрэчы насельніцтва з Чырвонай Арміяй!

У Ахрэмчыка карціна менш загрувашчана, але сюжэтная блытаніна ў ёй не меншая. Тут дзейнічаюць тыя-ж замардаваныя белапалякамі людзі. На першым плане, не зразумела, для чаго паказана згорбленая старая, накшталт варажбіткі. Народ у гэтай карціне не адчуваецца. Паказваючы радасць адных з прычыны прыходу Чырвонай Арміі, Ахрэмчык спрабуе паказаць у карціне і тых, каму гэта сустрэча не па душы. Зразумела, што ўся гэтая загрувашчанасць парушыла адзінства дзеі ў гэтай карціне, звяла на нішто і самы замысел.

У маладога мастака Манасзона памянёная работа — пакуль-што самая буйная і некаторым чынам справаздачная. Гэта творчая няўдача Манасзона яшчэ раз напамінае маладым мастакам аб тым, што адна жывапісная тэхніка яшчэ не робіць карціны, што апрача гэтага мастака павінен глыбока аналізіраваць падзеі, даводзіць задуманую мысль, як-бы яна ні была складаная, да такой прастаты і лаканічнасці, каб перакладзеная на мову фарбаў, яна ўспрымалася гледачом як захапляючая праўда жыцця.

Бяда нават не столькі ў тым, што Ахрэмчык і Манасзон хацелі вельмі многае сказаць у карціне, а ў тым, што яны не змаглі прывесці паказваемыя з'явы ў патрэбнае адзінства, не змаглі кампазіцыйна звязаць гэтыя з'явы, без чаго нельга чотка выявіць і самы сюжэт карціны. Кампазіцыя — гэта план, без гэтага плана карціна распаўзаецца на састаўныя часткі і замест адзінства дзеі атрымоўваецца бяссэнсавая стракатасць фарбаў.

Гутарка ідзе не толькі аб тэхніцы і кампазіцыі, а аб якасна новых рысах совецкага жывапісу. У каго-б ні вучыліся нашы маладыя мастакі — у вялікіх рускіх перасоўнікаў, ці ў французскіх рэалістаў, у іх творчасці павінны быць вырашаны якасна іншыя адносіны да свету, уласцівыя мастакам Совецкай эпохі.

Соцыялістычная эпоха, новыя, соцыялістычныя людзі. Ужо адно гэта гаворыць нам аб новых, нябачаных да гэтага часу ў гісторыі вобразах. Для таго, каб адлюстраваць гэты новы свет у мастацтве, неабходна, каб нашы мастакі побач з вывучэннем жывапіснай тэхнікі вывучалі жыццё і побыт нашага народа, улаўлівалі ў людзях новыя, толькі совецкім людзям уласцівыя пачуцці, стваралі на аснове гэтага вывучэння совецкі тыпаж, сапраўдныя жывыя вобразы совецкіх герояў у мастацтве. Але такой вучобы ў самога жыцця, на жаль, няма.

Некаторыя нашы мастакі замкнуліся ў сабе, наіўна думаючы, што шляхам чыстага ўяўлення яны змогуць знайсці і неабходны сюжэт і вобраз. Малады мастак Е. Ціхановіч, напрыклад, не маючы ў памяці ніякага запасу характэрных вобразаў, напісаў карціну «Орджанікідзе ў разведцы» з аднаго натуршчыка. У рэзультаце ўсе разведчыкі атрымаліся падобнымі адзін да другога. Гэта падобна на анекдот, але, на жаль, гэта факт.

Да ліку самых удалых работ маладых мастакоў, прадстаўленых на апошняй выстаўцы, трэба аднесці карціну А. Заборава «Чапаеўцы». Гэта першая ўдалая работа маладога мастака. Чапаеў на карціне паказан у чорнай бурцы і на белым кані, справа ад яго — Фурманаў, за імі — байцы на конях. З правага боку на ліхім кані да Чапаева падскакаў разведчык, паказваючы рукой у бок абнаружанага ворага.

Карціна добра задумана. Мастак змог надаць позам і выразам твараў Чапаева, Фурманава і іншых персанажаў перадбаявы настрой і рашучасць, змог увязаць усю конную групу з акружаючай прыродай. Стэп паказан у цёмназалацістых, а неба — у трывожных шэравата-карычневых тонах. Усё выступае ў адзінстве. Праўда, па карціне відаць, што Забораў яшчэ слаба валодае формай, але гэта ў дадзеным выпадку не зніжае агулам станоўчай ацэнкі яго карціны.

Асаблівая ўвага павінна быць звернута беларускімі мастакамі на батальны жывапіс, які набывае важнае значэнне ва ўмовах пагранічнай Беларусі. Да ліку баталістаў у нас можа быць аднесен толькі магілёўскі мастак К. Гедда. Гэты мастак валодае нядрэннай экспрэсіяй, кампазіцыйнай вынаходлівасцю, добра ведае ён і анатомію каня. Усё гэта дапамагло яму стварыць нядрэнную карціну «Разгром белапалякаў будзёнаўскай арміяй». Да недахопаў гэтай карціны трэба аднесці яе некаторую плакатнасць. Пры ўсёй экспрэсіі карціна не перадае таго новага духу Чырвонай Арміі як арміі рэволюцыйнага народа, таго, што карэнным чынам адрознівае яе ад арміі капіталістычных краін. У гэтай карціне адчуваецца некаторая універсальнасць тыпажу, над перамаганнем якой мастаку трэба шмат папрацаваць.

Вельмі важна, каб нашы мастакі ўзмоцнена працавалі і над стварэннем беларускага пейзажу. У нас шмат мастакоў, якія пішуць пейзажы, але па сутнасці няма ні аднаго сапраўднага пейзажыста. Пейзажы пішуцца з натуры, але ў іх не адчуваеш тых асаблівых фарбаў, якія ўласцівы беларускаму пейзажу.

Багата і старанна працуе над пейзажам Н. Дучыц. Гэта, несумненна, здольны жывапісец, але яму нехапае тэмпераменту і тых асабістых адносін да прыроды, якія пранізвалі ўвесь пейзаж і праз гэта даносілі-б замысел пейзажу да гледача. Складанасць уся ў тым, што гэта выяўленне ў пейзажы сваіх адносін да прыроды для совецкага пейзажыста не ёсць нешта суб'ектыўнае, а наадварот мастак павінен імкнуцца да таго, каб адносіны да прыроды ўспрымаліся гледачом як з'ява соцыяльная, звязаная з канкрэтнай, няхай і не бачанай, але адчуваемай на карціне з'явай самога жыцця. Гэтага абагульнення і нехапае пейзажам Дучыца. Яго пейзажы не хвалююць, не захапляюць, не прымушаюць думаць. Дучыц шчодры на фарбы, але гэта шчодрасць — не ад майстэрства.

Няма нічога дрэннага ў тым, што Дучыц вучыцца ў французскіх імпрэсіяністаў і ў рускага паслядоўніка гэтай школы К. Каровіна. Але вучыцца трэба крытычна. Пейзажам Дучыца, як і наогул пейзажам рускага імпрэсіянізма, уласціва некаторая дэкарацыйнасць і абумоўленая ёю плоскаснасць. Калі французскія імпрэсіяністы асабліва любілі паветраную перспектыву, дык Дучыцу гэта перспектыва не ўдаецца, перспектыва ў яго пераважна лінейная. У яго пейзажах няма глыбокіх гарызонтаў, увесь пейзаж выносіцца як-бы на першы план.

Да ліку лепшых пейзажаў Дучыца можна аднесці «Тарфяны бераг», у якім добра паказана вада і адлюстроўваемыя ў ёй бераг і неба. Вылучаюцца па каларыту «Лодкі», «У Прылуках» і рад эцюдаў, паказваючых ліствены лес. Асобна трэба вылучыць эцюд «Дрэвы», у якім мастаку параўнальна ўдаліся і колер і паветра.

Цяпер Дучыц працуе над вялікай карцінай «Гідраторф». Ім ужо зроблена некалькі эскізаў. Найбольш удалы апошні: у ім менш пейзажу, чым у іншых эцюдах, але затое ён найбольш поўна выяўляе вытворчы працэс гідраторфу.

У заключэнне хочацца пажадаць Дучыцу, каб ён глыбей прыглядваўся да беларускага пейзажу, глыбей акунаўся ў багатае падзеямі і новымі пачуццямі жыццё совецкага народа, імкнучыся праз гэта глыбокае асэнсаванне жыцця знайсці тое пачуццё якасна новага ўспрыняцця прыроды, якім павінен адрознівацца совецкі пейзаж.

Цяпер беларускія мастакі працуюць над вялікімі палотнамі да XX гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Работа надзвычай адказная. Нельга задаволіцца толькі адным цвярджэннем таго ці іншага эскізу мастацкай парадай. Неабходна, каб эскізы выносіліся на суд мастацкай і шырокай грамадскасці. Неабходна рабіць творчыя справаздачы нашых мастакоў, каб нашы мастакі мелі магчымасць па-душах пагаварыць са сваім гледачом. Трэба часцей наладжваць творчыя сустрэчы беларускіх мастакоў з лепшымі мастакамі Масквы і Ленінграда, што ў значнай меры будзе спрыяць іх творчаму росту.

А. ДАЛІН.

Нам. рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № М — 900.